Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

28 чэрвеня 2012 года, № 12–13 (2071–2072)

ПАДЗЕЯ

## У КАГОРЦЕ ВЫБРАНЫХ

**Дыплом «Ганаровы прафесар БДУ» ўручаны 5 чэрвеня Старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі Валянціне Мацвіенцы.**

Па словах рэктара БДУ акадэміка Сяргея Абламейкі, гэтага звання вядомы расійскі палітык удастоена за ўклад у развіццё беларуска-расійскіх сувязяў у галіне адукацыі, навукі і культуры. Такім чынам, Валянціна Мацвіенка стала 30-м ганаровым прафесарам нашага ўніверсітэта. У спісе вядомыя палітыкі, навукоўцы, грамадскія дзеячы з краін СНД, Германіі, Польшчы, Вялікабрытаніі, Чэхіі, Швецыі і іншых дзяржаў.

Валянціна Іванаўна шчыра падзякавала за аказаны ёй высокі гонар быць прафесарам такой славутай ВНУ. Яна адзначыла ўклад БДУ ў фарміраванне сусветнай навуковай эліты, яго высокі міжнародны аўтарытэт, а таксама актыўнае супрацоўніцтва з больш чым 100 ВНУ РФ. «БДУ вядомы ва ўсім свеце. Універсітэт можа ганарыцца сваімі выпускнікамі, сярод якіх шмат навукоўцаў, дыпламатаў і г. д., ёсць такія людзі нават у складзе маёй дэлегацыі», – адзначыла спікер Савета Федэрацыі. На яе думку, студэнтам універсітэта пашанцавала вучыцца ў такой выдатнай установе.

Затым Валянціна Мацвіенка выступіла на тэму, прысвечаную расійска-беларускім adносінам і ролі моладзі. Валянціна Іванаўна назвала вельмі паспяховым нядаўні візіт Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна ў нашу краіну і падкрэсліла стаўленне РФ да Беларусі як да асаблівага стратэгічнага партнёра. Ключавым пытаннем, на яе думку, сёння з'яўляецца інтэграцыя на постсавецкай прасторы, таму што ні адна асобна ўзятая краіна не можа быць канкурэнтаздольнай. І Расія з Беларуссю якраз паказваюць прыклад высокай формы інтэграцыі. Наступным крокам стане развіццё Еўразійскай камісіі як наднацыянальнага органа і падрыхтоўка да фарміравання еўразійскага парламента.



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

У эканамічнай сферы яна адзначыла значны рост тавараабароту Беларусі з РФ – на 38 % да 40 млрд долараў – і назвала найважнейшай задачай далейшую інавацыйную мадэрнізацыю эканомік і развіццё ІТ.

Звяртаючыся да моладзі, Валянціна Мацвіенка заклікала яе актыўна ўключацца ў аб'яднальныя працэсы ва ўсіх сферах і запэўніла, што Беларусь чакае светлая будучыня.

Затым яна больш за гадзіну адказвала на шматлікія пытанні студэнтаў пра яе ўражанні ад Беларусі, палітычную кар'еру, дыпламатычную дзейнасць і парламенцкую працу. Напрыканцы яна адзначыла, што няма людзей неталенавітых і няздольных і што ключ да поспеху ў руках у кожнага чалавека. Для гэтага трэба праяўляць працавітасць, мэтанакіраванасць і адказнасць. «Акрамя таго, павінна быць пастаянная праца над сабой з пункта гледжання адукацыі. Я, да прыкладу, вучуся ўсё жыццё, і гэта павінна быць унутранай патрэбай», – заўважыла Валянціна Мацвіенка.

**Сяргей ШАФАЛОВІЧ**

**Валянціна Іванаўна МАЦВІЕНКА** – савецкі і расійскі дзяржаўны дзеяч, палітык, дыпламат. Нарадзілася ў Хмяльніцкай вобласці (Украіна). У 1998–2003 гг. была намеснікам Старшыні Урада Расійскай Федэрацыі. У 2003–2011 гг. з'яўлялася губернатарам і старшынёй урада Санкт-Пецярбурга. З 2011 г. узначальвае Савет Федэрацыі Федэральнага Сходу Расіі.

Мае дзяржаўныя ўзнагароды, у тым ліку ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга (1982), «Знак Пашаны» (1976), «За заслугі перад Айчынай» 3-й ступені (1999) і 2-й ступені (2009).

Чытайце ў нумары:

**АД СТОГАДОВАЙ ХАТЫ ДА «ГЛАБАЛЬНАЙ» ВЁСКІ**
Гутарка з доктарам філалагічных навук прафесарам Віктарам ІЎЧАНКАВЫМ, пад навуковым кіраўніцтвам якога вялася распрацоўка новай рэдакцыі Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі
Стар. 2

**У АКТЫЎНАЙ ФАЗЕ**
Дэлегацыя БДУ брала ўдзел у IV Харбінскай міжнароднай выставе навукова-тэхнічных дасягненняў
Стар. 3

## Весткі з рэктарата

ЭКСПЕРТ Сусветнага банка, адказнага за фарміраванне індэкса эфектыўнасці лагістыкі Моніка Аліна Мустра 22 чэрвеня наведала Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У сустрэчы прынялі ўдзел кіраўніцтва БДУ, прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, транспарту і камунікацый нашай краіны, а таксама БНТУ, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ і МІПСА. Тэмай абмеркавання стала падрыхтоўка спецыялістаў па лагістыцы ў свеце і ў нашай краіне.

* * *

ПРЭМІЯЙ трох акадэмій навук (Беларусь, Расія, Малдова) ганараваны 21 чэрвеня прарэктар па эканоміцы і інвестыцыях БДУ Уладзімір Панарадаў і дэкан фізічнага факультэта Віктар Анішчык за цыкл прац у складзе калектыву аўтараў «Фазавыя і структурныя мадыфікацыі павярхоўных слаёў і плёнак у тэхналогіі паўправадніковых прылад і ЗВІС».

* * *

ПАГАДНЕННЕ аб супрацоўніцтве падпісана паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Вышэйшай школай Мітвайда (Hochschule Mittweida-University of Applied Sciences) (Германія). Пагадненне паслужыць асновай для стварэння праграм навучання на першай і другой ступенях адукацыі, якія прадугледжваюць атрыманне двух дыпломаў (беларускага і нямецкага).

Вышэйшая школа Мітвайда заснавана ў 1867 г. у Саксоніі. Ва ўніверсітэце ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў па інфармацыйных тэхналогіях і электратэхніцы; механічным і дакладным машынабудаванні; матэматыцы, фізіцы, інфарматыцы; эканамічных навуках; сацыяльнай працы і СМІ.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

УРАЧЫСТАСЦІ

## У добры шлях!

**Выпускны баль для студэнтаў-грамадзян замежных дзяржаў адбыўся 21 чэрвеня ў БДУ.**

Удзельнікамі ўрачыстасці сталі 146 выпускнікоў 14 факультэтаў БДУ. Больш за ўсё дыпломаў – 94 – сёлета атрымалі нядаўнія студэнты эканамічнага факультэта, на другім месцы – Інстытут журналістыкі (13 дыпломаў). А з прадстаўнікоў дзяржаў лідзіруюць грамадзяне КНР – 101 выпускнік. 17 чалавек, якія вызначыліся ў вучобе, атрымалі ганаровыя граматы ВНУ.

Выхаванцаў БДУ павіншаваў рэктар акадэмік Сяргей Абламейка, які выказаў спадзяванне, што выпускнікі будуць памятаць сваю альма-матар і што атрыманая ў нашай ВНУ адукацыя стане для маладых замежных спецыялістаў моцным падмуркам у іх прафесійным жыцці.

Даў наказ маладым людзям і міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч. Перш за ўсё ён падзякаваў прафесарска-выкладчыцкаму складу БДУ за якасную падрыхтоўку маладых замежных спецыялістаў. Звяртаючыся да нядаўніх студэнтаў, ён выказаў спадзяванне, што ў кожнага з іх застанецца пачуццё глыбокай удзячнасці да людзей, якія іх выгадавалі, і да нашай краіны, якая дала ім магчымасць атрымаць годную адукацыю. «У сваю чаргу ў Беларусі назаўжды засталіся часцінкі кожнага з вас, і наша краіна стала ад гэтага багацейшай, – адзначыў міністр. – Ваша сяброўства за час вучобы з беларусамі будзе спрыяць развіццю сучасных ведаў і навукі і можа выліцца ў плённыя эканамічныя сувязі».



Фота Аляксандра СНАПКА

Выпускнікоў павіншавалі і дэканы факультэтаў, а таксама кіраўнікі пасольстваў тых дзяржаў, грамадзяне якіх навучаліся ў БДУ. У мерапрыемстве ўдзельнічалі кіраўнікі дыпламатычных місій Кітайскай Народнай Рэспублікі, В'етнама, Туркменістана, Азербайджана, Казахстана, а таксама прадстаўнікі пасольстваў Арменіі, Грузіі, Расіі і Украіны.

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**

# Віктар Іўчанкаў: ад стогадовай хаты да «глабальнай» вёскі

**Да свайго пяцідзесяцігадовага юбілею Віктар Іванавіч ІЎЧАНКАЎ падышоў з унушальным спісам навуковых рэгалій – загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ, доктар філалагічных навук, прафесар, пад навуковым кіраўніцтвам якога вялася распрацоўка новай рэдакцыі Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. Пра шлях ад далёкай вёсачкі да вяршынь айчыннай навукі – сённяшняя гутарка з юбілярам.**



Фота Генадзя КРАСКОЎСКАГА

***– Віктар Іванавіч, якім быў Ваш шлях да беларушчыны? Ці Вам адразу лягла на душу беларуская мова?***

– Напэўна, не з гэтага трэба пачынаць. Я нарадзіўся ў прыгожай зялёнай-зялёнай вёсачцы Хадынічы, што ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці. Мне давялося жыць у хаце, якая існавала – ужо на той час – недзе 100 гадоў. Казалі, што яна была пабудавана з аднаго велічэзнага дрэва, на пні якога можна было б зрабіць танцпляцоўку. Тады ў вёсцы панаваў зусім іншы настрой. Вельмі цаніўся вопыт старэйшых, да іх меркавання прыслухоўваліся, з парад рабілі высновы. Усё гэта нітавалася ў вясковы аўтарытэт, пэўны парадак, парушыць які нікому не дазвалялася. «А што людзі скажуць...» – так мераліся ўчынкі. Зразумела, гэта накладала адбітак. На адчуванне свету, адносін да людзей. У інфармацыйную эпоху менавіта СМІ, інтэрнэт, сацыяльныя сеткі становяцца рэгулятарамі і вымяральнікам сутнасці духоўнага сталення людзей. Можна сказаць, сумленнем. Як у вёсцы. Бо наша зямля сціснулася да адной інфармацыйнай, ці, па вызначэнні Маклюэна, «глабальнай» вёскі...

Мама складала вершы, хаця была простай сялянкай, любіла спяваць песні, расказваць розныя гісторыі. Мае старэйшыя – я шостае дзіця ў сям'і – на маміны запісы амаль не звярталі ўвагі, а я быў уражаны. Тое, што мяне вабіць філалагічны напрамак, было зразумела з дзяцінства, і вершы пісаліся. Хаця матэматыка, асабліва алгебра, у пэўны перыяд таксама заваражвала. Цяжэй было выбраць – займацца літаратурай ці мовай. Калі ўжо вучыўся ў Брэсцкім педагагічным інстытуце, мне лёгка даваліся распрацоўкі ўрокаў па літаратуры, чаго не скажаш пра ўрокі па мове. Падавалася, што ў літаратуры няма той строгасці, што існуе ў лінгвістыцы. Мацільда Пракопаўна Дзямідава, дацэнт, кандыдат філалагічных навук, аўтар дапаможнікаў па стылістыцы, якая чытала ў нас сучасную рускую літаратурную мову, прапанавала тэму для курсавой працы – стылістычныя асаблівасці выкарыстання тропаў у творах рускага пісьменніка Юрыя Казакова, які тады быў мала вядомы (сёння яго творчасць упісана ў залаты фонд рускай літаратуры). Гэта і стала першым крокам у стылістыку. А да беларушчыны, як Вы кажаце, прыйшоў праз родную хату. Для мяне гэта непарыўныя паняцці. Хаця на Кобрыншчыне амаль няма беларускіх фанетычных асаблівасцей: ні дзекання, ні цекання, ні акання. Беларушчына ў маім жыцці звязана з навукай, да якой далучыўся праз рускую мову. Бо вельмі захапляўся словам, хацеў навучыцца адчуваць яго. У гэтым дапамагла любоў да творчасці Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. На той час некаторыя яго творы былі цяжкадаступныя, а я вынайшаў «Гаўрыліяду». Паэма, ад якой Пушкіна прымушалі адракчыся, уразіла мяне смеласцю, дзёрзкасцю выкладу інтымнага пачування. І толькі калі прыехаў у Мінск вучыцца ў аспірантуры Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР, то трапіў у беларускамоўны асяродак. Мой навуковы кіраўнік, доктар філалагічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі Аляксандр Мікалаевіч Булыка прапанаваў заняцца вывучэннем мовы і стылю твораў Уладзіміра Караткевіча. Караткевіч у сваіх творах не мог напрамую выразіць свае погляды і меркаванні, але ён цудоўна рабіў гэта іншым шляхам – у тропах, слоўных сродках вобразнасці. Так што мой шлях да беларускай мовы асветлены і асобай Караткевіча. Калі трапіў у БДУ, мне не ставала смеласці выкладаць беларускую мову, бо ў той час паралельна ў Мінскім педагагічным універсітэце імя Горкага выкладаў сучасную рускую літаратурную мову. І калі Аркадзь Іосіфавіч Наркевіч запрасіў на кафедру стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, то я быў упэўнены, што іду выкладаць журналістам рускую мову. Аднак, прыйшоўшы ў аўдыторыю, у поўнай разгубленасці дазнаўся, што павінен выкладаць фанетыку беларускай мовы. З лёгкай рукі прафесара А. І. Наркевіча, маючы базавую адукацыю выкладчыка рускай мовы, я стаў беларускамоўным лектарам. І ні кроплі не пашкадаваў пра гэта пасля. І ў студэнцкай аўдыторыі, і ў аўдыторыі з выкладчыцкім складам розных навучальных устаноў, і ў Савеце Міністраў, дзе на працягу навучальнага года выкладаў родную мову. Беларуская мова з таго часу стала для мяне сродкам не толькі прафесійных зносін, але і асабістых.

***– Раскажыце, калі ласка, пра Ваша навуковае сталенне. Як атрымалася скончыць аспірантуру датэрмінова?***

– У мяне такая завядзёнка па жыцці – калі бяруся за нейкую важную справу, то з асцярогай, што магу не справіцца. Таму прыкладаю шмат намаганняў, каб адолець яе. Так было і ў час аспірантуры. У акадэміі навук ёсць цудоўная бібліятэка, у мяне там быў прыгожы стол з мноствам кніжак на паліцы. У аспіранцкім пакоі інтэрната не раз скрыжоўвалі пікі з філосафам у лінгвістыцы, а цяпер маім добрым сябрам прафесарам Васілём Іванавічам Сянкевічам, які мог падкінуць самыя шалёныя ідэі. Такі асяродак стымуляваў і развіваў інтарэс да навукі. Не хадзіў, а лётаў. Відаць, таму так хацелася радавацца жыццю. Яно бруіла. Ажаніўся са сваёй аднакурсніцай Вольгай, з'явілася дачка Ліза, і гэта яшчэ болей прымушала працаваць. Пасля напісання дыпломнай працы ў мяне быў добры задзел, так што шмат сіл на дысертацыю не спатрэбілася. Ды і пісаць яе было надзвычай цікава. Мне хацелася раскрыць механізм дасягнення майстрам слова аптымальнага эстэтычнага эфекту.

***– Чаму Вы, з моцнай філалагічнай загартоўкай, апынуліся на журфаку, чаму зацікавіліся журналістыкай?***

– Не думаў, што з такой цікавасцю буду даследаваць СМІ. Аднак так распарадзіўся лёс. Трапіўшы ў журналісцкі калектыў, мусіў крыху інакш зірнуць на вербалістыку ўвогуле. Прыходзілася пераконваць, што журналіст павінен ведаць мову так, каб сістэматызаваць яе ў канкрэтным тэксце, самому быць яго актыўным стваральнікам. Публіцыстычны тэкст паўстае ў форме дыскурсу – складанай камунікатыўнай з'явы, «фрагментам рэчаіснасці, рэалізаваным у тэксце». У эпоху інфармацыйнага грамадства, на фоне ІТ-працэсаў слова стала самым дарагім прадуктам, які ў СМІ набывае асаблівы кошт. А журналістам доўгі час адмаўлялі ў праве нават на мінімальную творчасць – маўляў, ёсць граматычны каркас, адно падстаўляй формы. Жыццё паказала, што гэта далёка не так.

***– Журналістыку Вам давялося засвойваць на практыцы: былі саветнікам міністра па сувязях са СМІ і грамадскасцю, прэс-сакратаром, карэспандэнтам, загадчыкам аддзела, даволі працяглы час вялі «Педагагічны экран» на БТ, сёння з'яўляецеся першым намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Беларуская мова і літаратура», членам рэдкалегій часопісаў і газет...***

– Гэта спаўна рэалізуецца ў вельмі цікавай для мяне і, спадзяюся, для студэнтаў дысцыпліне – медыярыторыцы. Як журналіст павінен падыходзіць да сваёй прафесіі, якія можа выкарыстаць вербальныя і невербальныя тактыкі? Чаму, напрыклад, сёння так шмат моўнай агрэсіі, якая перарастае нават у фізічную? У 1995 годзе на тэледэбатах «Адзін на адзін» распачалася гонка за такога роду сенсацыямі.

Рыторыка выплюхнутай шклянкі, прымітыўнай бойкі ў студыі – пазнака нашага часу, калі даволі часта не стае аргументаў, такту, не хапае розуму давесці сваю думку, не стае элементарнай культуры. Была дапушчана прафесійная памылка: апанентаў (Жырыноўскага і Нямцова) паставілі ў недапушчальную для такой сітуацыі адлегласць, твар да твару, у так званую інтымную блізкасць. Перадача дала імпульс невербальнай разбэшчанасці, што прарастае ў стратэгіі і тактыкі, нават тэхналогію журналісцкага працэсу.

***– У той жа момант адбываецца і дэвальвацыя слова?***

– Кожнаму часу характэрны свой маўленчы густ. Слова не паддаецца дэвальвацыі. Каб гэта было інакш, то, відаць, даўно не было б ні рускай мовы, ні беларускай. У розныя перыяды ім пагражала знікненне: рускую выцясняла французская, прычынай чаго стала грэбаванне народнымі каранямі, пісьмовая форма беларускай мовы на працягу XIX-XX стст. была пад забаронай.

Пісьмовая мова заўсёды стрымлівае развіццё вуснай, бо яна кадыфікаваная, адлюстраваная ў графіцы, тады як вусная мова спрабуе расхістаць каноны пісьмовай мовы. Паколькі пісьмовая форма беларускай мовы была неактыўнай, то не было стрымальнага фактару для шпаркага развіцця вуснай формы. І гэтаму ёсць цудоўныя ілюстрацыі. У рускай мове гавораць «железная дорога», у беларускай — «чыгунка»; «соломенная шляпа» — «брыль»; «устал с дороги» — «здарожыўся»; «падающая звезда» — «znічка» і тысячы іншых. Такая тэндэнцыя да семантычнай сцісласці ў беларускай мове выходзіць менавіта з вуснага маўлення, якое значна апераджае пісьмовую практыку. Зараз ёсць праблема пранікнення традыцый пісьмовай формы ў вуснае маўленне. Усе гэтыя «специфические особенности», «потенциальные возможности», «на сегодняшний день», «актуальные проблемы» і шмат іншых казённых, кандовых словазлучэнняў – гэта выразы-інваліды, якія шляхам калькавання з рускай мовы перайшлі і ў беларускую, якой яны не ўласцівы. І працэсы, якія зараз нарастаюць у мове, пра што Вы, відаць, гаворыце, – гэта ў пэўнай ступені хвароба росту пасля аднастайнасці, шаблону, стандарту XX стагоддзя. Жывое слова заўсёды імкнецца да эканоміі. Беларуская мова, дарэчы, вельмі выйграе ў такой сітуацыі – дзякуючы вуснай традыцыі яна ёмістая, эканомная. А ўвогуле, маўленне ІТ-сферы ачышчае мову ад пустых і збыткоўных выразаў. Чалавек ніколі так часта і многа не пісаў, як піша сучаснік. Блогер, чацер, аўтар уласнага сайта павінен пісьмова фармуляваць свае думкі, а значыць, выяўляцца праз слова. Шчаслівы час...

**Гутарыла**
**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

**ІЎЧАНКАЎ Віктар Іванавіч** – доктар філалагічных навук, прафесар. Мовазнаўца і журналіст. Нарадзіўся **28 чэрвеня 1962 г.** у вёсцы Хадынічы Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У **1985 г.** закончыў Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.С.Пушкіна. У **1988 г.** датэрмінова закончыў аспірантуру пры Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. З **1989 г.** працуе ў БДУ спачатку на пасадзе дацэнта, з **1996 г.** – загадчыка кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі. Аўтар больш за 350 навуковых і метадычных прац, у тым ліку сямі манаграфій. Займаецца даследаваннем стылістыкі беларускай і рускай моў. Заснавальнік на Беларусі навуковай школы дыскурснага аналізу СМІ. Вядзе актыўную асветніцкую працу па прапагандзе роднага слова. Змясціў на старонках друку звыш 200 публіцыстычных матэрыялаў па праблемах адукацыі, навукі і выхавання. Член Беларускага саюза журналістаў **(1994).** Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь **(1999).** Выдатнік друку Рэспублікі Беларусь **(2006).** Лаўрэат прэміі імя У.І.Пічэты за цыкл навукова-адукацыйных дапаможнікаў па гісторыі і тэорыі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі **(2011).** Лаўрэат прэміі БСЖ за найлепшую журналісцкую работу ў Рэспубліканскім творчым конкурсе «Залатое пяро» **(2011).**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# У АКТЫЎНАЙ ФАЗЕ

**Буйная дэлегацыя БДУ прыняла ўдзел у працы IV Харбінскай міжнароднай выставы навукова-тэхнічных дасягненняў (14–18 чэрвеня).**

БДУ прадстаўлялі рэктар акадэмік Сяргей Абламейка, прарэктар па навуковай рабоце акадэмік Алег Івашкевіч, начальнік ГУПЭІД Ірына Антаневіч, навукоўцы-распрацоўшчыкі: Сяргей Басякоў, Валерый Лапанік, Уладзімір Шаблоўскі, загадчык сектара інфармацыйнага забеспячэння ўпраўлення навукова-інавацыйнай дзейнасці ГУН Таццяна Апанасевіч і каардынатар навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва БДУ з КНР Вячаслаў Лявонаў. На выставе былі прадстаўлены каля 50 тэхналогій, новых матэрыялаў і перспектыўных распрацовак у галіне фізікі, хіміі, інфарматыкі, радыёэлектронікі, прыкладной матэматыкі і г. д.

Усяго падпісаны ***5 дамоў аб супрацоўніцтве*** і абмеркаваны працоўныя дакументы па падрыхтоўцы адпаведных кантрактаў, якія будуць падпісаны бакамі восенню 2012 г. па наступнай тэматыцы:

1. Антыкаразійныя і антыбактэрыяльныя фарбы для апрацоўкі карпусоў марскіх і рачных судоў (НДІ ФХП БДУ і Чаньчунскі інстытут прыкладной хіміі Цзылінскай акадэміі навук).

2. Распрацоўка вуглеродных валокнаў і крэмній-вуглеродных валокнаў, узмоцненых фасфатнымі кампазіцыямі (НДІ ФХП БДУ і інстытут нафтахіміі Хэйлунцзянскай акадэміі навук).

3. Сінтэз і ачыстка вадкіх крышталёў (БДУ і інстытут нафтахіміі Хэйлунцзянскай акадэміі навук).

4. Распрацоўка сучасных камп'ютарных тэхналогій, якія дазваляюць ажыццяўляць кантроль устойлівасці механічных сістэм, якія змяшчаюць неўраўнаважаныя часткі, што хутка круцяцца (БДУ, механіка-матэматычны факультэт, і Харбінскі навукова-тэхнічны ўніверсітэт, механіка-інжынерны факультэт).

5. Хуткадзейная вадкакрышталічная прылада адлюстравання арыентацыі з вертыкальнай арыентацыяй малекул (НДІ ПФП БДУ і інстытут нафтахіміі Хэйлунцзянскай акадэміі навук).

Акрамя таго, заключаны 23 пратаколы аб намерах далейшага супрацоўніцтва.

***Асобна, з прэзідэнтам Хэйлунцзянскай акадэміі навук прафесарам Пань Чжунам падпісана Генеральнае пагадненне***, якое прадугледжвае развіццё двухбаковага супрацоўніцтва паміж навуковымі арганізацыямі Хэйлунцзянскай акадэміі навук і навукова-даследчымі ўстановамі БДУ з мэтай сумеснага развіцця навукі і тэхнікі, абмену навуковымі дасягненнямі.

На перамовах з *рэктарам Харбінскага ўніверсітэта навукі і тэхнікі прафесарам Лі Даюнам* дасягнута дамоўленасць аб далейшым развіцці праекта «Сумесная аспірантура». Мяркуецца значна павялічыць прыём кітайскіх грамадзян у аспірантуру на платнай аснове. Падчас перамоў вывучаны вопыт планавання, фарміравання бюджэту ўніверсітэта і вядзення гаспадарчай дзейнасці з мэтай атрымання прыбытку.

З *рэктарам Харбінскага політэхнічнага інстытута прафесарам Ван Шугуа* дасягнута дамоўленасць аб актывізацыі супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навукі, удзелу ў сумесных праектах у галіне інфарматыкі і авіякасмічнай тэхнікі.

У рамках Вышэйшага форуму па міжнародным навукова-тэхнічным супрацоўніцтве праведзены перамовы з прэзідэнтам Харбінскага інжынернага ўніверсітэта прафесарам Лью Чжыганам. Адбыўся абмен думкамі аб магчымасці ўдзелу ў сумесных праектах па навуковых напрамках, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Удзельнікам Вышэйшага форуму прадстаўлены даклад «Супрацоўніцтва БДУ ў галіне адукацыі і навукі з арганізацыямі КНР».

**Паводле інфармацыі ГУН і Беларуска-кітайскага інавацыйнага цэнтра**




*Падпісанне пагаднення з Інстытутам нафтахіміі Хэйлунцзянскай акадэміі навук*

ДАСЯГНЕННІ

**Маладыя навукоўцы БДУ сталі лаўрэатамі XVIII Рэспубліканскага конкурсу навуковых прац студэнтаў. Гэта: магістрант геаграфічнага факультэта Дзмітрый Вараб'ёў, магістрант філалагічнага факультэта Юлія Ягоркіна, магістранты факультэта міжнародных адносін Вольга Жукоўская і Андрэй Скрыба, выпускніца магістратуры фізічнага факультэта Яўгенія Круціліна, выпускнік ФРКТ Максім Леаненя, магістрант ФФСН Людміла Панамарова і студэнтка 3 курса біялагічнага факультэта Кацярына Усачова.**

Па агульнай колькасці лаўрэатаў БДУ заняў першую пазіцыю, падзяліўшы яе з БНТУ. На другім месцы па колькасці лаўрэатаў – ГрДУ імя Янкі Купалы, БДМУ і БДЭУ, а на трэцім – БДУІР, ГрДМУ, МДУХ і ПДУ.

Усяго было разгледжана 4025 навуковых прац, аўтарамі якіх сталі 4257 прадстаўнікоў 59 беларускіх ВНУ. Кіравалі маладымі навукоўцамі 3093 выкладчыкі. На конкурсе ад БДУ была прадстаўлена 221 навуковая праца. Аўтары 8 з іх сталі лаўрэатамі, 37 працам прысуджана 1 катэгорыя, 61 – другая, і 53 працы адзначаны дыпломамі 3-й катэгорыі.

КАНТАКТЫ

# КУРС НА КУРСК

**30–31 мая адбыўся візіт прадстаўнікоў Паўднёва-Заходняга дзяржаўнага ўніверсітэта (Курск) у БДУ, вынікам якога стала падпісанне двухбаковай дамовы аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве.**

ПЗДУ прадстаўлялі прарэктар па інфармацыі і спецыяльных праектах Алег Атакішчаў і начальнік цэнтра касмічнай сувязі Валяр'ян Пікіеў. На сустрэчы з рэктарам БДУ акадэмікам Сяргеем Абламейкам і прарэктарам Уладзімірам Панарадавым абмяркоўвалася магчымасць супрацоўніцтва са спецыялістамі РКК «Энергія» імя С. П. Каралёва і лётчыкамі-касманаўтамі ў галіне праектавання і эксплуатацыі апаратуры для касмічнай радыёсувязі і мікраспадарожнікаў серыі «Радыёскаф» і «Кедр», якія запускаюцца з МКС.

Госці наведалі цэнтр аэракасмічнай адукацыі ФРКТ і аддзел аэракасмічных даследаванняў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі, дзе ім былі паказаны новыя распрацоўкі: лётны ўзор спектрафотаметрычнага комплексу, які праходзіць апошнія выпрабаванні перад адпраўкай (2013 г.) на борт МКС у складзе шматмэтавага лабараторнага модуля, і фотаспектральную сістэму, якая з 2010 г. праўце на борце МКС. Расійскія калегі азнаёміліся таксама з авіяцыйнай спектразанальнай сістэмай АВІС, якая яшчэ распрацоўваецца.

Абмяняўшыся інфармацыяй, спецыялісты дзвюх ВНУ дамовіліся пра супрацоўніцтва ў галіне аэракасмічнай адукацыі і ўзаемадзеянне ў распрацоўцы малых касмічных апаратаў, для стартаў якіх можа быць выкарыстана МКС.

**Алесь НОВІКАЎ**

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**5 чэрвеня**
**Рагойша Вячаслаў Пятровіч,** загадчык кафедры тэорыі літаратуры

**6 чэрвеня**
**Шышкіна Таццяна Вікенцьеўна,** прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі і астрафізікі

**12 чэрвеня**
**Лапіцкая Наталля Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і матэматычнай эканомікі

**21 чэрвеня**
**Буга Сяргей Уладзіміравіч,** загадчык кафедры заалогіі

**22 чэрвеня**
**Няпеўная Наталля Томашаўна,** начальнік упраўлення кадраў

**28 чэрвеня**
**Іўчанкаў Віктар Іванавіч,** загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання

**1 ліпеня**
**Паўлава Людміла Кранідаўна,** дацэнт кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі

**2 ліпеня**
**Важнік Сяргей Аляксандравіч,** дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы

**5 ліпеня**
**Гаўрылка Галіна Мікалаеўна,** дацэнт кафедры міжнародных эканамічных адносін

**6 ліпеня**
**Арлоўская Алена Іванаўна,** дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права

**10 ліпеня**
**Хвясеня Наталля Паўлаўна,** дацэнт кафедры тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі

**14 ліпеня**
**Васількоў Дзмітрый Міхайлавіч,** дацэнт кафедры дыскрэтнай матэматыкі і алгарытмікі

**15 ліпеня**
**Літвіноўскі Іван Афанасьевіч,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі

**19 ліпеня**
**Селіванаў Андрэй Уладзіміравіч,** намеснік дэкана факультэта міжнародных адносін

**20 ліпеня**
**Паплаўская Лідзія Андрэеўна,** дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій

**24 ліпеня**
**Брыгадзіна Вольга Васільеўна,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі

*Спіс усіх імяніннікаў размешчаны на сайце БДУ www.bsu.by ў раздзеле «Нашы юбіляры».*

**Паводле інфармацыі ўпраўлення кадраў БДУ**

# БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Удзел навукова-тэхнічнай прадукцыі БДУ на выставе ў Харбіне** – БелТА, zn.by, open.by (14.06).

**Цырымонія ўручэння дыплома «Ганаровы прафесар БДУ» Старшыні Савета Федэрацыі РФ Валянціне Мацвіенцы** – БелТА, Інтэрфакс, БелаПАН, «Рэспубліка», respublika.info, naviny.by, ИТАР-ТАСС, РИА, rbc.ru, mk.ru, kp,ru, date.bs, zn.by, 21.by, tut.by, СТБ, БТ, АНТ (05.06); regnum.ru (06.06); «Народная газета», ng.by (06.06, 07.06); «Настаўніцкая газета» (07.06); «Знамя юности» (08.06-14.06); «ЛіМ» (08.06); vminsk.by (14.06); «Минский курьер», mk.by (15.06).

**Выстава кітайскіх мастакоў, якая адкрылася ў Мінску пры ўдзеле РІК імя Канфуцыя БДУ** – БелТА, 21.by (11.06, 12.06); БелаПАН (12.06); «ЛіМ» (15.06).

**Выпускны баль у ліцэі БДУ** – БелаПАН, naviny.by, date.bs, 21.by (10.06).

**Вяртанне Статута ВКЛ на Беларусь, ініцыятарам якога стаў студэнт гістфака Андрэй Радкоў** – «Беларусь–1» (06.06); onliner.by, АНТ (07.06); 21.by (06.06, 07.06); «Звязда», zvyazda.by (08.06); open.by (10.06).

**Рэктар Сяргей Абламейка пра планы адкрыцця ў БДУ англамоўнай магістратуры** – БелТА, tut.by, 21.by (06.06).

**Рэгістрацыя на ЦТ, прахадныя балы і іншае пра прыёмную кампанію** – Інтэрфакс (06.06, 13.06, 14.06); date.bs (07.06, 14.06); tut.by, 21.by (08.06); kp.by (11.06); «СБ–Беларусь сегодня», sb.by (12.06); «Беларусь–1», 21.by (13.06); open.by (14.06).

**Аб методыцы неінвазіўнай дыягностыкі крыві, распрацаванай навукоўцамі БДУ** – «Рэспубліка», respublika.info, tut.by (05.06).

**У абсерваторыі БДУ каментуюць рэдкую магчымасць убачыць з Зямлі Венеру без спецыяльных прылад** – tut.by, «Минский курьер» (05.06).

**Сустрэчы вядомых журналістаў са студэнтамі Інстытута журналістыкі БДУ ў межах VII Беларускага медыяфоруму** – «Минский курьер», mk.by (01.06); «Знамя юности» (01.06-07.06); «ЛіМ» (15.06).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

СТУДЭНЦКІ МЕРЫДЫЯН

# На стажыроўку ў Еўропу

**Студэнты БДУ маюць самыя шырокія ў Рэспубліцы Беларусь магчымасці для навучання за мяжой: наша ВНУ мае велізарную сетку міжнародных партнёраў (больш за 300), для студэнтаў фарміруецца база даных міжнародных праграм стыпендый і грантаў, рэалізуюцца акадэмічныя абмены ў рамках міжнародных праграм. Адной з іх з'яўляецца праграма ЕС «Эразмус Мундус».**



*Арганізацыйны сход удзельнікаў праграмы «Эразмус Мундус» у БДУ*

Не сакрэт, што сёння маладым людзям для паспяховай кар'еры пасля заканчэння ВНУ патрабуюцца веды і навыкі не толькі па сваёй спецыяльнасці, але і валоданне замежнымі мовамі, а таксама здольнасці кантактаваць з рознымі культурамі, г. зн. навыкі міжкультурнай камунікацыі. Напрыклад, Еўрапейскім Саюзам да 2020 г. запланавана давесці долю выпускнікоў ВНУ, якія прайшлі навучанне за мяжой, да 20 %. Самі ВНУ таксама зацікаўлены ў тым, каб іх студэнты падчас вучобы мелі магчымасць паглыбіць свае веды і палепшыць прафесійныя навыкі за мяжой. І гэта відавочна: запатрабаваныя выпускнікі на рынку працы – гэта поспех і аўтарытэт самога ўніверсітэта. Для гэтага ў БДУ прынята Праграма перспектыўнага развіцця на 2011–2015 гг. Яна прадугледжвае паступовае павелічэнне міжнародных акадэмічных абменаў праз развіццё праграма міжуніверсітэцкага супрацоўніцтва, актыўнага ўдзелу ў міжнародных праграмах і праектах.

Ідэя ***праграмы «Эразмус Мундус»*** – арганізацыя абменаў студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі і выкладчыкамі ў рамках вялікіх міжуніверсітэцкіх аб'яднанняў, або кансорцыумаў, якія складаюцца з 15–20 ВНУ. Варта адзначыць, што абмены адбываюцца паміж еўрапейскімі ВНУ з аднаго боку, і ВНУ краін СНД – з другога. Фінансаванне абменаў ажыццяўляецца са сродкаў Еўрапейскага Саюза.

У рамках гэтай праграмы студэнты і выкладчыкі БДУ маюць магчымасць прайсці навучанне або стажыроўку ў такіх еўрапейскіх ВНУ, як універсітэт Турку (Фінляндыя), універсітэт Бардо І (Францыя), універсітэт імя Аляксандра фон Гумбальта (Германія), універсітэт імя Арыстоцеля ў Салоніках (Грэцыя), Балонскі ўніверсітэт (Італія), Вільнюскі ўніверсітэт (Літва), універсітэт Дэуста (Іспанія), універсітэт Альгарве (Партугалія) і Гуманітарная акадэмія імя А. Гейштара (Польшча). Адбор кандыдатаў ажыццяўляецца на конкурснай аснове. Усяго за перыяд удзелу БДУ ў дадзенай праграме (з 2007 г.) больш за 150 чалавек павысілі кваліфікацыю за мяжой.

У красавіку 2012 г. завяршыўся чарговы конкурс стыпендый для навучання і стажыровак у рамках гэтай праграмы. БДУ стаў абсалютным лідарам як па колькасці пададзеных заявак (трацінa ад усёй колькасці кандыдатаў з 11 ВНУ СНД), так і па колькасці выйгрышных грантаў: з 87 адабраных кандыдатаў на навучанне ў еўрапейскіх ВНУ 30 – гэта студэнты, магістранты, аспіранты, выкладчыкі і выпускнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На арганізацыйным сходзе для ўдзельнікаў праграмы «Эразмус Мундус» пераможцаў ад імя БДУ павіншаваў начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Вадзім Рэзнікаў. Ён адзначыў, што поспех студэнтаў БДУ ў конкурсе праграмы – паказчык высокай якасці адукацыі, якая даецца ва ўніверсітэце, сведчанне прафесіяналізму выкладчыкаў нашай ВНУ.

Пра магчымасці навучання і стажыровак за мяжой для ўсёй акадэмічнай супольнасці БДУ можна даведацца на інтэрнэт-сайце нашай ВНУ *www.bsu.by* ў рубрыцы «Міжнародная дзейнасць». Там жа можна падпісацца і на электронную рассылку інфармацыі пра міжнародныя праграмы акадэмічнай мабільнасці.

### ПЯЦЬ ПРАВІЛАЎ ПАДРЫХТОЎКІ І ПАДАЧЫ ДАКУМЕНТАЎ

**Правіла 1.** Падача своечасова. Загадзя рыхтуйце асноўныя віды патрэбных дакументаў (завераныя копіі дыпломаў і сертыфікатаў з іх перакладамі на замежную мову, накіды матывацыйных лістоў, кароткія апісанні вашых навуковых праектаў, спісы навуковых публікацый, CV і г. д.).

**Правіла 2.** Правільнасць афармлення і адпраўкі. Уважліва чытайце патрабаванні, што прад'яўляюцца да афармлення дакументаў (спосаб завярэння перакладу, прашыўка копій, электронны фармат «сканаў», парадак іх размяшчэння ў шматстаронкавым файле і г. д.).

**Правіла 3.** Паўната і адпаведнасць. Падавайце ўсё, што патрабуецца, і пры гэтым не перагружайце ваш application package лішнімі дакументамі.

**Правіла 4.** Чысціня і карэктнасць. Дакументы павінны быць у належнай чысціні і не ўтрымліваць граматычных і фактычных памылак.

**Правіла 5.** Самастойнасць. Гэта правіла азначае, што не варта задаваць адміністратарам стыпендыяльных праграм такіх пытанняў, адказы на якія вы можаце атрымаць самастойна, вывучаючы правілы праграмы.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА КАНКУРСАНТАЎ

– Дастатковы ўзровень папярэдняй адукацыі (для навучання на ўзроўні магістратуры, напрыклад, апошні курс універсітэцкай адукацыі).

– Веданне замежнай мовы (як правіла, патрабуецца веданне замежнай мовы на ўзроўні B2 – Upper Intermediate па еўрапейскай класіфікацыі, г. зн. «вышэйшы за сярэдні»).

– Высокая матывацыя (здольнасць даказаць сувязь замежнай стажыроўкі з будучай кар'ерай у Беларусі). Тут вельмі важна заручыцца рэкамендацыямі ад вашых навуковых кіраўнікоў або перспектыўных працадаўцаў, гатовых «займець» вас пасля заканчэння замежнай стажыроўкі.

**Аляксандр РЫТАЎ, начальнік аддзела міжнародных праграм і праектаў УМС БДУ**

ІНІЦЫЯТЫВЫ

# ДЗЕЛАВАЯ АДУКАЦЫЯ – ПЕРАДУМОВА ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА

**Выпуск навучэнцаў «Школы прадпрымальніцтва і менеджменту для моладзі «Уласная справа» адбыўся ў БДУ шосты раз. Паўгода школьнікі і студэнты асвойвалі асновы прадпрымальніцтва, менеджменту, маркетынгу, псіхалогіі бізнесу, якія ў далейшым паспрыяюць адкрыццю ўласнай справы.**

### ЗАПАТРАБАВАНЫ ВОПЫТ

У 2006 г., калі цэнтр сістэмных даследаванняў праблем моладзі БДУ стварыў школу, многія былі ўпэўнены, што школьнікі, бізнес і прадпрымальніцтва – паняцці ўзаемавыключальныя, а студэнтаў старэйшых курсаў цікавіць будучая прафесійная дзейнасць толькі ў дзяржаўных структурах.

Сёння вопыт ЦСДПМ сур'ёзна вывучае Міністэрства адукацыі. Бізнес-планы выпускнікоў школы нядаўна былі паспяхова прадэманстраваны на рэспубліканскай нарадзе рэктараў ВНУ. Зверсткі, як ідуць справы з развіццём прадпрымальніцкіх ініцыятыў сярод моладзі, цэнтр прадставіў у Еўрапейскі савет па адукацыі, які вельмі пазітыўна ацаніў тое, што ў нашай краіне мэтанакіравана займаюцца дзелавой адукацыяй. У сусветнай практыцы гэта з'яўляецца першай умовай для далейшага развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, якім наканавана стаць масавай з'явай.

Прыхільныя водгукі яшчэ больш упэўнілі ЦСДПМ у неабходнасці падрыхтоўкі прадпрымальніка з усвядомленай грамадзянскай пазіцыяй і сацыяльнай адказнасцю за вынікі сваёй дзейнасці.

### ЗЯРНЯТЫ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Дырэктар цэнтра *Любоў Шумская* гаворыць, што няблага было б, каб ВНУ з розных рэгіёнаў краіны займелі такія адукацыйныя модулі. Іх перавага ў тым, што яны ажыццяўляюць дадатковую адукацыю, якая мае практычную скіраванасць. У школе прадпрымальніцтва ў БДУ за адной партай сядзяць студэнты розных прафесій: дызайнеры, журналісты, юрысты, артысты, фізкультурнікі, і гэта не перашкаджае ім выношваць ідэі для сумесных праектаў. Нярэдка яны аб'ядноўваюцца, каб стварыць агульны бізнес-план. Аднак пакуль у ВНУ гэты працэс не атрымаў развіцця. А вось у агульнаадукацыйных навучальных установах Мінскай вобласці апошнім часам назіраецца сапраўдны рух у падтрымку «школьнага прадпрымальніцтва»: арганізоўваюцца школьныя бізнес-клубы і бізнес-кампаніі, праводзяцца бізнес-канферэнцыі навучэнскай моладзі. Школу БДУ там лічаць адным з ініцыятараў дзіцячай прадпрымальніцкай дзейнасці.

«Калі мы арганізоўвалі школу прадпрымальніцтва ва ўніверсітэце, то адразу зрабілі акцэнт на тым, што яно можа паспяхова развівацца паўсюль у Беларусі, а не толькі ў буйных гарадах, як прынята лічыць. Школьнікі – гэта і ёсць тое зерне, якое з цягам часу дасць шматлікія руні прадпрымальніцкай дзейнасці ў нашай краіне», – гаворыць Любоў Іванаўна. Дагэтуль у цэнтры сістэмных даследаванняў праблем моладзі займець сваю ўласную справу навучылася каля 200 школьнікаў. Тут не цешаць сябе ілюзіяй, што юнак ужо ў 9–10-м класе пасля спецыяльнага навучання ў стане яе адкрыць самастойна. Задача заключаецца ў тым, каб пазнаёміць школьнікаў з сутнасцю прадпрымальніцкай дзейнасці. Яны павінны разумець эканамічныя заканамернасці, у якіх ім прыйдзецца жыць. Толькі ў такім выпадку любы выбар, які яны зробяць у далейшым – на карысць уласнай справы, працы ў дзяржаўных структурах або прыватных фірмах, будзе ўсвядомлены.

Любоў Шумская як навуковец займаецца праблемамі сацыялізацыі асобы і сведчыць, што прадпрымальніцтва служыць развіццю чалавека: нарадзіць новую ідэю не так проста, а ўкараніць яе ў жыццё – тым больш. Любоў Іванаўна падкрэслівае, што прадпрымальніцкае мысленне павінна разумецца не толькі як крэатыўнае, нестандартнае, творча-арыентаванае, а ў першую чаргу як здольнасць самарэалізавацца ў канкрэтнай справе. На яе думку, прадпрымальніцтва не толькі ставарае дадатковыя працоўныя месцы – яно задае мадэль паводзін для ўсяго грамадства.

### ЗМЯНІЦЬ ПСІХАЛОГІЮ ЛЮДЗЕЙ

У цэнтры сістэмных даследаванняў праблем моладзі БДУ дапамагаюць і ў адкрыцці ўласнай справы. Ім важна, як уладкаваліся ў жыцці выпускнікі школы прадпрымальніцтва. Падчас нашай размовы Любоў Шумская працавала над мемарандумам аб супрацоўніцтве з таварыствам бізнес-анёлаў і венчурных інвестараў «БАВІН», куды ўваходзяць буйныя прадпрымальнікі Беларусі, якія ахвотна ідуць на кантакт з прадстаўнікамі цэнтра і згодныя інвеставаць у найбольш удалыя бізнес-праекты выпускнікоў яго школы. Зараз дасягнута дамоўленасць з моладзевай сацыяльнай службай Мінгарвыканкама «Бізнес-інкубатар», якая бярэцца прадставіць новым прадпрымальнікам працоўныя месцы для вядзення бізнесу, а таксама кансультацыі эканамістаў, юрыстаў на льготных умовах.

Аднак немалаважнае значэнне для адкрыцця ўласнай справы маюць асабістыя якасці прэтэндэнта: яго псіхалагічная гатоўнасць, стрэсаўстойлівасць, здольнасць прымаць самастойныя рашэнні ў самых складаных умовах. З іншага боку, важным застаецца і сацыяльны аспект, тыя перадумовы, якія існуюць у грамадстве. «Сёння, згодна са шматлікімі даследаваннямі, у Расіі назіраецца тэндэнцыя працаўладкавання моладзі ў дзяржаўных установах, хоць і за невялічкую заработную плату. Бо своечасова не было ўлічана, што для жыцця ў рынкавым грамадстве варта спачатку памяняць псіхалогію людзей. Калі гэтага няма, то заканамерны высокі працэнт няўдач і правалаў у адкрыцці ўласнай справы. У Беларусі ёсць магчымасць вучыцца на памылках суседзяў. Таму паспяховая дзейнасць першай школы прадпрымальніцтва ў сістэме ўніверсітэта мае важнае сімвалічнае значэнне», – упэўнена Любоў Шумская.

**Ганна ЛАГУН**

УНІВЕРСІТЭТ

У ПРАФКАМЕ

# Вынікі і перспектывы

**Напрыканцы мая прайшла справаздачная канферэнцыя пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ за 2009–2012 гг. Ганаровымі гасцямі былі намеснік старшыні ЦК прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман Дапіра і прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзімір Сувораў.**

Старшыня прафкама *Ніна Радзевіч* адзначыла, што сёння ППА студэнтаў БДУ – самая шматлікая арганізацыя, у складзе якой 20350 членаў (93,7 % ад усіх студэнтаў ВНУ). Сваю дзейнасць студэнцкі прафкам вядзе па 8 кірунках. Акрамя таго, былі створаны камісія па рабоце сярод жанчын, ахове сям'і, мацярынства і дзяцінства, а таксама цэнтр сацыялагічных даследаванняў і цэнтр псіхалогіі. З 2011 г. праводзяцца «Дні прафсаюзнай інфармацыі ў БДУ» з удзелам прадстаўнікоў ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. Традыцыйным стаў конкурс на найлепшую пастаноўку работы па арганізацыі ўступлення студэнтаў 1 курса ў члены галіновага прафсаюза. Павышэнню іміджу арганізацыі спрыяюць семінары, круглыя сталы, конкурсы.

Прафсаюз надае ўвагу і адраснай сацыяльнай дапамозе студэнтам. Пра гэта сведчаць такія акцыі, як: «Прафсаюзы – дзецям», «Збяры дзіця ў школу», «Дзед Мароз прыходзіць у дом» для дзяцей-інвалідаў супрацоўнікаў і студэнтаў, наведванне падшэфных сацыяльных прытулкаў.

Вялікае значэнне адводзіцца і пытанням адукацыйнага працэсу. Так, вучэбна-вытворчая камісія выконвала функцыю грамадскага кантролю прызначэння сацыяльных і спецыяльных стыпендый. Рэагаванне на звароты навучэнцаў, унясенне прапаноў дэканатам – далёка не ўсё, чым займаецца камісія.

Па словах старшыні камісіі *Яўгена Ільянава*, прафсаюз гатовы вылучыць шэраг прапаноў, якія дазволяць якасна дапрацаваць палажэнне аб матэрыяльным стымуляванні студэнтаў і аспірантаў ВНУ. Напрыклад, варта разгледзець варыянт стварэння асобнага фонду пастаянных надбавак, фонду разавых надбавак і прэміяльнага фонду. Яшчэ разглядаецца пытанне наконт магчымасці студэнтаў карыстацца бібліятэчным фондам розных падраздзяленняў БДУ.

На жаль, камісія пакуль не можа ўплываць на распрацоўку раскладу вучэбных заняткаў, як гэта адбываецца за мяжой. «Аднак сумесна з цэнтрам сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ мы правялі адпаведны аналіз, – распавядае Яўген Ільянаў. – У выніку выявілася праблема нераўнамернасці вучэбнай нагрузкі. Напрыклад, колькасць семінарскіх (практычных) заняткаў у канцы кожнага семестра ўзрастае да 3–4 у дзень, што не супярэчыць ніякім нарматывам. Аднак відавочна, што ў такой сітуацыі навучэнцы павінны затрачваць на выкананне хатняй працы значна больш часу, чым звычайна, а гэта ўплывае на якасць падрыхтоўкі да заняткаў і эфектыўнасць засваення матэрыялу».

Сіламі прававой камісіі актыўна вядзецца праца па заключэнні пагаднення паміж БДУ і ППА студэнтаў. Па словах старшыні камісіі *Вольгі Уласавай*, ужо наладжаны плённы дыялог з адміністрацыяй БДУ. Праект пагаднення на 2012–2014 гг. – гэта гарантыі, сацыяльны пакет, форма ўзаемадзеяння адміністрацыі ВНУ і прафсаюзнай арганізацыі, накіраваная на паспяховую рэалізацыю сацыяльна-эканамічнай палітыкі.

Пастаўленыя перад прафкамам студэнтаў БДУ задачы дасягнуты. Аднак толькі шчыльнае супрацоўніцтва арганізацыі і кіраўніцтва ВНУ дасць магчымасць выйсці на новы ўзровень. Так, на справаздачнай канферэнцыі прагучалі новыя прапановы па арганізацыі адпачынку і аздараўлення навучэнцаў у летні перыяд на базе САК «Брыганціна» і матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні спартыўнай залы комплексу, па ўдзеле прадстаўнікоў прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў пры правядзенні навучальных семінараў для супрацоўнікаў універсітэта, вылучэнні на факультэтах памяшканняў для працы прафбюро.

Такая маштабная праца дазваляе ахапіць практычна ўсе сферы студэнцкага жыцця.

**Святлана ВАСІЛЕЎСКАЯ**






# МОВА ЯК ДАР

**Вера Барысаўна Хацкевіч усё жыццё займалася вывучэннем і параўнальным аналізам розных моў. Яна лічыць, што мова – гэта вялікі дар Бога чалавеку, які ацаніць належным чынам немагчыма. І сёння, калі яна завучвае новае слова на замежнай мове, атрымлівае духоўнае задавальненне. Сёлета ў чэрвені Вера Барысаўна адсвяткавала сваё 85-годдзе.**

У БДУ яна пачала выкладаць у 1955–1956 гг. Тады ж абараніла і кандыдацкую дысертацыю, у якой прааналізавала суфіксальнае словаўтварэнне ў сучаснай беларускай мове ў параўнанні з рускай, украінскай, балгарскай, польскай і іншымі. Не толькі славянскія мовы апынуліся ў полі зроку Веры Барысаўны. Выкладаючы рускую мову як замежную для арабаў на падрыхтоўчым факультэце нашага ўніверсітэта, яна ў свой час самастойна вывучыла арабскую мову. А затым здала кваліфікацыйны экзамен прадстаўнічай камісіі ўніверсітэта імя Патрыса Лумумбы. Менавіта абапіраючыся на родную мову замежных студэнтаў, ёй удавалася даступна растлумачыць ім, як пабудаваны сказ у рускай мове. Для таго, каб замежнікі прасякнуліся духам культуры рускага народа, яна купляла для іх шмат дзіцячых казак. Апошнія гады Вера Барысаўна вучыла арабскай мове ў прыватным парадку беларусаў, якія выязджалі на пастаяннае месца жыхарства ці на адпачынак у арабскія краіны.

Усім, хто хоча дасканала ведаць замежную мову, Вера Барысаўна раіць чытаць на ёй як мага болей розных кніг. Хоць яна не была за мяжой, але ўпэўненая, што пры дапамозе літаратуры змагла зразумець душу многіх нацыянальнасцяў. Напрыклад, французскай мовай яна зацікавілася тады, калі чытала на ёй урыўкі ў творах Льва Талстога. У Веры Барысаўны была Біблія, надрукаваная адначасова на іўрыце і рускай мове. Яна старалася прачытаць яе ў абодвух варыянтах. Не сказаць, што ўвесь Каран Веры Барысаўне ўдалося адолець на арабскай, аднак некаторыя ўрыўкі ёй былі зразумелыя і без перакладу. З рускай літаратуры яе найбольш захапляюць кнігі пра Пятра І, Кацярыну ІІ, Аляксандра І, Мікалая І і інш. Творы беларускіх літаратараў яна стараецца прачытаць усе, нават дробныя. Вера Хацкевіч сабрала кнігу беларускага пісьменніка, цёзкі па прозвішчы і суайчынніка, Барыса Хацкевіча «Мая Бярэзіна». А знакамітыя беларускія пісьменнікі Янка Сіпакоў, Рыгор Барадулін і Барыс Сачанка калісьці вучыліся ў Веры Барысаўны лексікалогіі тады яшчэ на аддзяленні журналістыкі БДУ.

Сяло Ратуцічы Барысаўскага раёна, дзе 10 чэрвеня 1927 г. з'явілася на свет Вера Барысаўна Хацкевіч, з'яўляецца любімым месцам адпачынку і для сям'і яе сына Юрыя Піскуна, вядомага мастака, а таксама дачкі Людмілы Давыдоўскай. На радзіме Веру Барысаўну і яе творчую сям'ю ведаюць і заўсёды чакаюць.

**Ганна ЛАГУН**

ЭЎРЫКА!

# Сігнал з будучыні існуе

**Дацэнт кафедры псіхалогіі ФФСН Уладзімір Палікарпаў і студэнт 3 курса аддзялення псіхалогіі Аляксандр Янкелевіч лабараторна даказалі існаванне сігналу з будучыні.**

У рамках дамовы аб супрацоўніцтве паміж БДУ і ўніверсітэтам Трэнта (Італія), падпісанай у 2010 г., адзін з вядучых спецыялістаў у галіне тэмпаралогіі Джорджыа Фантана прапанаваў Уладзіміру Палікарпаву паўтарыць эксперымент амерыканскага навукоўца Дарэла Бема, з дапамогай якога ўдалося атрымаць сігнал з будучыні. У выніку сумеснага беларуска-італьянскага эксперыменту меркавалася праверыць, ці сапраўды гэта працуе і, калі гэта так, даць такому факту навуковае тлумачэнне. Праграмісты Трэнта напісалі спецыяльную праграму, правядзенне эксперыменту лягло на беларускі бок – Уладзіміра Палікарпава і студэнта Аляксандра Янкелевіча. Эксперымент пацвердзіў, што сапраўды можна атрымліваць сігналы з будучыні. Зараз гэта навукова зарэгістраваны факт.

Трохі больш падрабязна пра сам эксперымент.

Даследаванне заснавана на выкарыстанні эксперыменту сусветна вядомага амерыканскага псіхолага з Карнелскага ўніверсітэта Дарэла Бема. На экране манітора з'яўляюцца дзве шырмы. Паддоследнаму прапануецца адгадаць, за якой з іх схаваны малюнак. Рэальна там нічога няма. Толькі пасля таго, як паддоследны робіць выбар, уключаецца генератар выпадковых лікаў і выпадковым чынам выбірае, будзе там малюнак ці яго не будзе. З'яўляецца апаяшчэнне, ці з'яўляецца выбар правільным. Так праводзяцца 2 сесіі па 36 спроб. У эксперыменце выкарыстоўваюцца 2 тыпы малюнкаў: нейтральныя і эмацыйна насычаныя. Размеркаванне ўгадвання нейтральных малюнкаў – выпадковае, а эмацыйна насычаныя адгадваюцца часцей. Усе выявы адабраны з дапамогай міжнароднай бібліятэкі афектыўных малюнкаў. Статыстыка паказвае, што гэта не выпадкова, што чалавек сапраўды атрымаў сігнал з будучыні і малюнак, які павінен з'явіцца на экране, ужо прыцягвае яго рашэнне.

У даследаванні бралі ўдзел 60 чалавек, 31 мужчына і 29 жанчын, сярод якіх большасць студэнтаў факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ. Велізарную працу правёў Аляксандр Янкелевіч, на якога лягло само правядзенне эксперыменту: інструктаж, адаптацыя камп'ютарнай методыкі, стварэнне базы даных. Як адзначыў У. Палікарпаў, «гэта самастойная праца калегі Янкелевіча. Тут няма майго кіраўніцтва. Зразумела, мы абмяркоўвалі яе, але гэта хутчэй удзел, чым кіраўніцтва». У. Палікарпаў адказваў за арганізацыю эксперыменту, падбор стымульнага матэрыялу і матэматычную апрацоўку даных. Інтэрпрэтацыяй атрыманых вынікаў займаліся спецыялісты з Трэнта.

Па выніках даследавання А. Янкелевіч напісаў артыкул (ён ёсць на сайце цэнтра прадугадвання Сяргея Краўчанкі), які атрымаў высокую ацэнку вядомых навукоўцаў у галіне даследавання прыроды часу Міхаіла Шульмана, Юрыя Лебедзева.

Пазней усе ўдзельнікі эксперыменту – Джорджыа Фантана, Уладзімір Палікарпаў і Аляксандр Янкелевіч – напісалі сумесны артыкул на англійскай мове (яго можна прачытаць на сайце Інстытута даследаванняў прыроды часу пры МДУ). Цяпер чакаецца інтарэс навуковай грамадскасці да гэтай навіны і шырокае яе абмеркаванне. А мы чакаем новых эксперыментаў і новых сенсацый!



***Палікарпаў Уладзімір Аляксеевіч** – кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт кафедры псіхалогіі ФФСН БДУ. У красавіку 2011 г. прызначаны кіраўніком лабараторыі-кафедры практычнай філасофіі часу Web-інстытута даследаванняў прыроды часу пры МДУ.*

**Аліна ЮДЗІНА**

МАЙСТРОЎНЯ

# Зачынілі «Браму мар»

**Рэспубліканскі конкурс літаратурнай творчасці студэнтаў «Брама мар» у другі раз прайшоў у БДУ.**

Многія студэнты пішуць вершы ці прозу, жарты, скетчы, казкі – карацей, маюць схільнасць да літаратурнай творчасці. Зразумела, далёка не ўсім ім наканавана стаць знакамітымі пісьменнікамі, але ж і засоўваць у далёкую шуфляду студэнцкія творы не варта – вырашылі на журфаку, дзе канцэнтрацыя «пісучых» студэнтаў традыцыйна высокая. Задумалі творчай лабараторыяй «Крытык» пры кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ, конкурс два гады запар выяўляў самых літаратурна адораных навучэнцаў ВНУ. Найбольшай папулярнасцю ў абодва гады карысталіся намінацыі «Паэзія» (сёлета – каля 140 удзельнікаў) і «Проза» (гэтым годам 60 канкурсантаў). Менш студэнтаў займаецца перакладамі, піша драматычныя творы, сцэнары ці мастацкую крытыку – аднак і да гэтых намінацый сярод навучэнскай моладзі была цікаўнасць.

## ПААЗІЯ СХЕМ

Абодва гады конкурс праводзіўся па аднолькавай схеме – абвяшчаўся шэраг намінацый, з дасланых заяў журы абірала ўсталяваную колькасць прац, іх аўтарам высылалася заданне для фіналу, яго выкананне зноў ацэньвала журы, што дазваляла выявіць пераможцаў. Другі год адрозніваўся пашыраным складам журы (побач з вядомымі літаратарамі ў яго ўвайшлі выкладчыкі літаратуры, побач з беларускамоўнымі – рускамоўныя), ускладненай сістэмай ацэнкі прац (алімпійская сістэма пры падліку балаў ад розных сяброў журы мусіла забяспечыць максімальную аб'ектыўнасць, але ж і спрычынілася да некаторай усярэдненасці вынікаў у самай суб'ектыўнай намінацыі – «Паэзіі»). Апрача гэтага, зараз пры падвядзенні вынікаў улічвалася ініцыятыўнасць і адказнасць канкурсанта, праяўленыя падчас творчых сустрэч і іншых запланаваных арганізатарамі акцый. Мала быць таленавітым – трэба ўмець працаваць у пэўных рамках ды імкнуцца развіваць свой талент.

## КРЫТЫЧНЫМ ВОКАМ

Навучыць ствараць літаратуру немагчыма, а вось зрабіць спрыяльнае асяроддзе, у якім малады творца зможа расквітнець, што той ананас у аранжарэі, цалкам рэальна. Для гэтага на «Браме мар» быў праведзены шэраг творчых сустрэч і майстар-класаў, на якіх сталыя літаратары распавядалі пра свае творчыя хітрыкі, бязлітасна крытыкавалі і багата хвалілі творчасць канкурсантаў, у кулуарах дамаўляліся пра рэдагаванне твораў маладых калег. Крытычныя разборы, па задуме арганізатараў, мусілі падрыхтаваць творцаў да таго, што літаратура – справа жорсткая і ў ёй трэба ўмець прымаць канструктыўную крытыку, пры гэтым заставацца сабой, захоўваць свой твар.

Адна справа – строгі, але камерны разбор твораў знаўцамі, і зусім іншая – ухваленне або няўважлівасць шырокай публікі. Ад таго, як творца агучвае напісанае ім (падчас прэзентацыі кнігі, напрыклад), часта залежыць поспех у чытача. У «брамамарцаў» было адразу некалькі магчымасцяў павучыцца зачароўваць публіку – на выставе «СМІ ў Беларусі», дзе фіналісты выступалі на стэндзе Інстытута журналістыкі БДУ, на вечарынах цыкла «Тут-вам-літ», якія сабралі пярэстую аўдыторыю, і на фінальнай вечарыне, дзе трэба было не сесці макам перад тавалрышамі-канкурсантамі, сябрамі журы і разнайтымі высокімі гасцямі. Што ж, яшчэ Напалеон казаў, калі ў яго спыталі, як заваяваць свет: «Практыка, практыка, практыка».

## КАЗАЧНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Адна справа – пісаць «у стол», і зусім іншая – калі твае творы прачытае невядомая і няпэўна-вялікая аўдыторыя. Радасць першай публікацыі часта дапамагае маладым не забыцца на свой талент сярод штодзённых клопатаў і студэнцкіх турботаў. Таму адна з асноўных задач конкурсу палягала ў тым, каб дапамагчы маладым творцам патрапіць у літаратурны працэс – для гэтага былі і яшчэ будуць арганізаваны публікацыі падборак твораў фіналістаў «Брамы мар» у літаратурна-мастацкіх выданнях краіны. Апрача публікацый у перыёдыцы, фіналісты могуць спадзявацца атрымаць і кніжную публікацыю – кніга па двух гадах конкурсу рыхтуецца ў выдавецтве «Літаратура і мастацтва». Прытым гэта выданне парадуе не толькі канкурсантаў, але і тых, хто з нейкіх прычын не ўзяў удзел у літаратурным спаборніцтве – побач з творамі самых канкурсантаў у кнігу плануецца ўключыць матэрыялы майстар-класаў, якія могуць быць карысныя ўсім пачаткоўцам у літаратуры. Ну а найбольш пашанцавала аўтарам твораў для дзяцей – іх цудоўныя казкі, вершы і лапатушкі будуць аб'яднаны ў асобную кнігу, якую падрыхтуе выдавецтва «Мастацкая літаратура», слаўнае сваімі шыкоўна аформленымі кнігамі і добрай прамоцыяй аўтараў.

## ПРОЗА ЖЫЦЦЯ

Публікацыі – гэта добра, але для сапраўднага свята патрэбны яшчэ нейкі прыз, пажадана каштоўны. Паколькі праект «Брама мар» быў падтрыманы грантам конкурсу «Найлепшы маладзевы праект БДУ», з прызамі ўсё мусіла атрымацца як найлепей. Але… але самы творчы факультэт атрымаўся яшчэ і самым гультайскім, праз што фінал даводзілася пераносіць усё далей і далей, у выніку фіналісты спярша злаваліся, а потым проста перасталі рэагаваць на паведамленні ад арганізатараў. Тым не менш усё скончылася добра: пераможцы і фіналісты атрымалі прызы, а матадказныя – заслужаныя прэміі.

## ДРАМАТЫЧНАЯ ПАЎЗА

Патэнцыял у конкурсу, відавочна, вялікі – яшчэ не ва ўсіх ВНУ адкрылася творчая «Брама мар», яшчэ не ўсе жанры літаратурнай творчасці былі абвешчаны ў якасці намінацый, ды і ў правядзенні тых, што былі абвешчаны, яшчэ шмат чаго можна напрыдумляць. Аднак заяўлены рэспубліканскі маштаб патрабуе адпаведнай каманды і фінансавання, таму арганізатары вырашылі ўзяць гадавы тайм-аўт – падрыхтаваць кнігі твораў фіналістаў, падрахункаваць зробленае, знайсці спонсараў. Можна сказаць, што «Брама мар» зачыняецца на рэканструкцыю – чакайма яркага адкрыцця праз год!

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

### ДАВЕДКА

*«Брама мар» з'явілася на журфаку ў 2010–2011 навуч. годзе. Спаборніцтва задумвалася студэнтамі для студэнтаў. Першы сезон прайшоў даволі прадуктыўна – удзельнікамі конкурсу сталі каля 200 студэнтаў з 14 беларускіх ВНУ. Сёлета ўдзельнічалі каля 225 чалавек з 25 беларускіх ВНУ. Найбольш удзельнікаў з БДУ (103 чалавекі), з БДУКіМ і Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце РБ (па 21 удзельніку), з БДПУ імя М. Танка (14 удзельнікаў), БНТУ (9 чалавек).*

*Сябры журы:*

*Проза: Галіна Багданава, Людміла Рублеўская, Гражына Паўлоўская*

*Паэзія: Арцём Кавалеўскі, Віка Трэнас, Дзмітрый Строцаў*

*Творы для дзяцей: Раіса Баравікова, Алена Масла, Уладзімір Ліпскі*

*Драматургія: Алена Мальчэўская, Пятро Васючэнка, Таццяна Сівец*

*Крытыка: Зміцер Вішнёў, Маргарыта Аляшкевіч, Ірына Шаўлякова*

*Сцэнар: Людміла Саянкова, Людміла Перагудава*




ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# МЕДЫЯАДУКАЦЫЯ XXI ст.

**Летняя школа журналістыкі прайшла ў апошнія дні мая ў рамках VII міжнароднага медыяфоруму «Партнёрства ў імя будучыні: мадэлі новай эпохі».**

У адкрыцці летняй школы прынялі ўдзел міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Алег Праляскоўскі, міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь Сяргей Маскевіч, рэктар БДУ Сяргей Абламейка, дырэктар Інстытута журналістыкі Сяргей Дубовік, а таксама знакамітыя госці з блізкага і далёкага замежжа. Сярод іх можна назваць Віталя Трацякова, дэкана Вышэйшай школы (факультэта) тэлебачання МДУ імя М. Ламаносава, Яраслава Скварцова, дэкана факультэта міжнароднай журналістыкі МДІМА (універсітэта) МЗС Расіі, а таксама Міхаіла Гузуна, дэкана факультэта журналістыкі дзяржаўнага ўніверсітэта Малдовы і Аляксандра Іскандарана, дырэктара Каўказскага інстытута СМІ Арменіі.

Для студэнтаў Інстытута журналістыкі было арганізавана каля 20 майстар-класаў, якія правялі выкладчыкі, вядомыя тэлевядучыя і журналісты з Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы, Арменіі і Індыі. Іх тэмы красамоўныя: «Улада і журналіст», «Асаблівасці працы рэпарцёра ў online-рэжыме», «Час фаст-фуду і фаст-рыду. Ці ёсць будучыня ў папяровай журналістыкі?», «Сакрэты майстэрства сучаснага журналіста», «Інфармацыйная вайна: мінулае, сучаснасць і будучыня». Падчас мерапрыемства былі арганізаваны два круглыя сталы, дзе абмяркоўваліся пытанні медыяадукацыі XXI ст. Сярод журналістаў-практыкаў, якія падзяліліся сваім майстэрствам са студэнтамі, запомніліся Тамара Вяцкая, першы намеснік старшыні тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы, а таксама Ігар Панарын, вядучы праграмы «Сусветная палітыка» на РДРК «Голас Расіі» і рэдактар аддзела палітыкі часопіса «Саюз». Падчас працы летняй школы журналістыкі была арганізавана і творчая сустрэча з доктарам Сваві Партасарацці, які з'яўляецца старшынёй і кіраўнічым дырэктарам Індыйскага інстытута менеджменту і даследаванняў імя Шры Шарада.

Сёлетні форум быў прызваны звярнуць увагу на надзённыя праблемы сучаснасці ва ўмовах фарміравання новых геапалітычных рэалій. Ён сабраў больш за 100 удзельнікаў з 16 краін свету. Былі запрошаны эксперты, палітолагі, эканамісты, вядучыя медыйныя персоны краін Садружнасці, Балтыі, Кубы, Кітая, Індыі, Венесуэлы, сярод якіх і кіраўнікі большасці інфармацыйных агенцтваў краін СНД.

**Ганна ЛАГУН**

АНОНС

# Тэатралы з усяго свету збяруцца ў БДУ

**Адна з самых значных міжнародных тэатральных падзей гэтым летам пройдзе ў Мінску. БДУ сумесна з Міжнароднай асацыяцыяй універсітэцкіх тэатраў (AITU-IUTA) з 2 па 6 ліпеня правядзе IX Сусветны кангрэс Міжнароднай асацыяцыі універсітэцкіх тэатраў.**

Упершыню ў гісторыі Беларусі пройдзе тэатральны з'езд такога маштабу. На тыдзень у беларускай сталіцы збяруцца найлепшыя тэатральныя дзеячы, выбітныя тэатральныя кампаніі і самыя ўплывовыя тэатральныя арганізацыі з 35 краін свету, сярод якіх Міжнародны інстытут тэатра пры ЮНЕСКА і яго Генеральны сакратар сп. Тобіяс Б'янконе.

У рамках кангрэсу пройдзе IX Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар». У ім возьмуць удзел 13 тэатраў з 10 краін. Як заўсёды, «Тэатральны куфар» пацешыць свайго гледача новымі праектамі. На гэты раз такім падарункам стане спецпраект «Па кім звоніць звон...», прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. У рамках праекта 3 ліпеня адбудзецца дэманстрацыя спектакляў на ваенную тэматыку.

Конкурсную праграму, у адрозненне ад папярэдніх фестываляў, будзе ацэньваць аўдыторыя гледачоў. А найлепшы з лепшых атрымае гран-пры.

Прэс-канферэнцыя адбудзецца 27 чэрвеня ў 10.00.

Падрабязная інфармацыя на сайце фестывалю: *http://www.theatre-fest.bsu.by.* Кантактны тэлефон: 209-54-69. E-mail: culture@bsu.by



# ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў АСПІРАНТУРУ І ДАКТАРАНТУРУ

## НА 2012 ГОД У БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

Прыём асоб для атрымання пасляўніверсітэцкай адукацыі незалежна ад падпарадкаванасці ўстановы адукацыі, а таксама навуковай спецыяльнасці, па якой рэалізуецца адпаведнага адукацыйныя праграмы, ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным Палажэннем аб падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь, зацверджаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 01.12.2011 № 561.

**Асобы, якія паступаюць у аспірантуру (ад'юнктуру), павінны мець:**

вышэйшую адукацыю, за выключэннем вышэйшай адукацыі I ступені;

схільнасць да навуковых даследаванняў, што пацвярджаецца навуковымі публікацыямі, удзелам у навукова-даследчых і інавацыйных праектах, канферэнцыях або іншымі матэрыяламі;

рэкамендацыю вучонага савета (савета) установы вышэйшай адукацыі або факультэта гэтай установы (для тых, хто паступае ў год заканчэння навучання ў дадзенай установе) або вопыт практычнай работы не меншы за два гады на пасадах, якія патрабуюць наяўнасці вышэйшай адукацыі.

Тыя, хто паступае ў аспірантуру для атрымання навуковай кваліфікацыі «Даследчык» у дзённай або завочнай форме атрымання адукацыі, павінны здаць кандыдацкія экзамены і залікі па агульнаадукацыйных дысцыплінах да паступлення ў аспірантуру.

Для тых, хто паступае ў аспірантуру для навучання ў завочнай форме атрымання адукацыі і ў форме суіскальніцтва, вопыт практычнай работы не меншы за два гады на пасадах, якія патрабуюць наяўнасці вышэйшай адукацыі, з'яўляецца абавязковым.

Для атрымання пасляўніверсітэцкай адукацыі I ступені па спецыяльнасцях педагагічнай галіны навукі прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую педагагічную адукацыю і стаж працы ў сферы адукацыі ў якасці спецыяліста з вышэйшай адукацыяй не меншы за два гады.

Допускаецца паступленне ў аспірантуру асоб, спецыяльнасць (спецыялізацыя) вышэйшай адукацыі якіх не адпавядае галіне навукі, па спецыяльнасці якой плануецца іх навучанне ў аспірантуры. У працэсе навучання дадзеныя асобы павінны таксама здаць экзамен у аб'ёме агульнаадукацыйнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (спецыялізацыі), якая супадае са спецыяльнасцю ў аспірантуры або блізкая да яе.

асобы, якія паступаюць у аспірантуру, падаюць на імя рэктара заяву, да якой прыкладаюць дакументы ў адпаведнасці з пералікам, што вызначаецца Міністэрствам адукацыі. Дакумент, які сведчыць асобу, і арыгіналы дакументаў аб адукацыі прад'яўляюцца пры паступленні ў аспірантуру асабіста.

Прыёмная камісія разглядае прадстаўленыя дакументы, праводзіць сумоўе з тымі, хто паступае для навучання ў аспірантуры, дактарантуры, і прымае заключэнне прыёмнай камісіі, афармленае ў выглядзе выпіскі з пратакола пасяджэння, у якім:

пры паступленні ў аспірантуру (ад'юнктуру) – даецца характарыстыка навуковага ўзроўню апублікаваных работ (навуковага рэферата), схільнасці кандыдата да навукова-даследчай працы, змяшчаецца прапанова аб допуску да ўдзелу ў конкурсе і ўступнага экзамену (пры паступленні для навучання ў дзённай або завочнай форме) альбо заключэнне аб актуальнасці тэматыкі і допуску да ўдзелу ў конкурсе (пры паступленні для навучання ў форме суіскальніцтва), выносіцца рэкамендацыя па кандыдатурах меркаваных навуковых кіраўнікоў.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру для навучання ў дзённай або завочнай форме атрымання адукацыі, здаюць уступны экзамен па спецыяльнай дысцыпліне ў аб'ёме вучэбнай праграмы I ступені вышэйшай адукацыі. Для атрымання пасляўніверсітэцкай адукацыі ў аспірантуры ў форме суіскальніцтва здача ўступнага экзамену не патрабуецца.

Ад здачы ўступнага экзамену па спецыяльнай дысцыпліне з выстаўленнем адзнакі «10» вызваляюцца лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў, альбо лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, альбо лаўрэаты рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў навуковых работ па дысцыплінах, якія адпавядаюць профілю абранай спецыяльнасці.

**ПЕРАЛІК СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯЎ, ПА ЯКІХ ПЛАНУЕЦЦА ПРЫЁМ У 2012 г.:**

**дзённая форма навучання:**

МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
01.01.01 Рэчыўны, комплексны і функцыянальны аналіз*
01.01.02 Дыферэнцыяльныя ўраўненні, дынамічныя сістэмы і аптымальнае кіраванне
01.01.04 Геаметрыя і тапалогія
01.01.06 Матэматычная логіка, алгебра і тэорыя лікаў
01.02.04 Механіка дэфармаванага цвёрдага цела
01.02.08 Біямеханіка
ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ
01.01.02 Дыферэнцыяльныя ўраўненні, дынамічныя сістэмы і аптымальнае кіраванне
01.01.05 Тэорыя верагоднасцяў і матэматычная статыстыка
01.01.09 Дыскрэтная матэматыка і матэматычная кібернетыка
05.13.18 Матэматычнае мадэляванне, лікавыя метады і комплексы праграм
08.00.13 Матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі
ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
01.04.02 Тэарэтычная фізіка
01.04.10 Фізіка паўправаднікоў
01.04.16 Фізіка атамнага ядра і элементарных часціц
13.00.02 Тэорыя і методыка навучання і выхавання (па галінах і ўзроўнях адукацыі)
03.01.02 Біяфізіка
ФАКУЛЬТЭТ РАДЫЁФІЗІКІ І КАМП'ЮТАРНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ
01.04.03 Радыёфізіка
01.04.04 Фізічная электроніка
05.13.01 Сістэмны аналіз, кіраванне і апрацоўка інфармацыі (па галінах)
05.13.19 Метады і сістэмы абароны інфармацыі, інфармацыйная бяспека
ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
02.00.01 Неарганічная хімія
02.00.02 Аналітычная хімія
02.00.03 Арганічная хімія
02.00.04 Фізічная хімія
02.00.06 Высокамалекулярныя злучэнні
02.00.09 Хімія высокіх энергій
БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
03.01.03 Малекулярная біялогія
03.01.04 Біяхімія
03.01.05 Фізіялогія і біяхімія раслін
03.01.06 Біятэхналогія (у тым ліку біянанатэхналогіі)
03.01.07 Малекулярная генетыка
03.02.07 Генетыка
03.02.08 Экалогія (па галінах)
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
07.00.02 Айчынная гісторыя
07.00.03 Усеагульная гісторыя (адпаведнага перыяду)
07.00.06 Археалогія
07.00.07 Этнаграфія, этналогія і антрапалогія
07.00.09 Гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання
24.00.03 Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў
ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
08.00.01 Эканамічная тэорыя
08.00.05 Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай (па галінах і сферах дзейнасці)
08.00.13 Матэматычныя і інструментальныя метады эканомікі
ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН
10.02.20 Параўнальна-гістарычнае, тыпалагічнае і супастаўляльнае мовазнаўства
10.02.22 Мовы народаў замежных краін Еўропы, Азіі, Афрыкі, абарыгенаў Амерыкі і Аўстраліі (усходніх моў)
10.02.19 Тэорыя мовы
07.00.15 Гісторыя міжнародных адносін і знешняй палітыкі
12.00.03 Грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права
12.00.10 Міжнароднае права; еўрапейскае права
08.00.14 Сусветная эканоміка
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
09.00.11 Сацыяльная філасофія
09.00.03 Гісторыя філасофіі
19.00.01 Агульная псіхалогія, псіхалогія асобы, гісторыя псіхалогіі
19.00.05 Сацыяльная псіхалогія
22.00.01 Тэорыя, метадалогія і гісторыя сацыялогіі
22.00.08 Сацыялогія кіравання
ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
10.01.01 Беларуская літаратура
10.01.02 Руская літаратура
10.01.03 Літаратура народаў краін замежжа (з указаннем канкрэтнай літаратуры)
10.01.09 Фалькларыстыка
10.02.01 Беларуская мова
10.02.19 Тэорыя мовы
КАФЕДРА АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ І МАЎЛЕНЧАЙ КАМУНІКАЦЫІ
10.02.19 Тэорыя мовы
ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ
10.01.10 Журналістыка
ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
12.00.01 Тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя вучэнняў аб праве і дзяржаве
12.00.02 Канстытуцыйнае права; муніцыпальнае права
12.00.03 Грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права
12.00.05 Працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння
12.00.06 Прыродарэсурснае права; аграрнае права; экалагічнае права
12.00.09 Крымінальны працэс, крыміналістыка; аператыўна-вышуковая дзейнасць
12.00.14 Адміністрацыйнае права, фінансавае права; інфармацыйнае права
12.00.15 Грамадзянскі працэс; арбітражны працэс*
23.00.01 Тэорыя і філасофія палітыкі, гісторыя і метадалогія палітычнай навукі
23.00.02 Палітычныя інстытуты, працэсы і тэхналогіі
23.00.04 Палітычныя праблемы міжнародных адносін, глабальнага і рэгіянальнага развіцця*
КАФЕДРА ФІЗІЧНАГА ВЫХАВАННЯ І СПОРТУ
13.00.04 Тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры*
ГУМАНІТАРНЫ ФАКУЛЬТЭТ
24.00.01 Тэорыя і гісторыя культуры
ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
25.00.23 Фізічная геаграфія і біягеаграфія, геаграфія глебаў і геахімія ландшафтаў
25.00.25 Геамарфалогія і эвалюцыйная геаграфія
25.00.33 Картаграфія
25.00.36 Геаэкалогія (па галінах)*

*Мэтавыя месцы

**завочная форма навучання:**

ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
01.04.07 Фізіка кандэнсаванага стану*
05.11.07 Аптычныя і оптыка-электронныя прыборы і комплексы
ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
02.00.03 Арганічная хімія*
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
07.00.02 Айчынная гісторыя*
07.00.09 Гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання
ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
08.00.01 Эканамічная тэорыя
08.00.05 Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай (па галінах і сферах дзейнасці)
ФАКУЛЬТЭТ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН
10.02.22 Мовы народаў замежных краін Еўропы, Азіі, Афрыкі, абарыгенаў Амерыкі і Аўстраліі (усходніх моў)
10.02.19 Тэорыя мовы
12.00.03 Грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права
12.00.10 Міжнароднае права; еўрапейскае права*
23.00.02 Палітычныя інстытуты, працэсы і тэхналогіі*
08.00.14 Сусветная эканоміка
ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
10.01.02 Руская літаратура*
10.01.09 Фалькларыстыка*
10.02.02 Руская мова*
КАФЕДРА АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ І МАЎЛЕНЧАЙ КАМУНІКАЦЫІ
10.02.19 Тэорыя мовы*
ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ
10.01.10 Журналістыка
ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
12.00.03 Грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права
12.00.05 Працоўнае права, права сацыяльнага забеспячэння*
12.00.08 Крымінальнае права і крыміналогія; крымінальна-выканаўчае права*
12.00.09 Крымінальны працэс, крыміналістыка; аператыўна-вышуковая дзейнасць*

* Мэтавыя месцы

**навучанне ў форме суіскальніцтва:**

МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
01.01.02 Дыферэнцыяльныя ўраўненні, дынамічныя сістэмы і аптымальнае кіраванне
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
07.00.02 Айчынная гісторыя*
24.00.03 Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў*
ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
08.00.05 Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай (па галінах і сферах дзейнасці)*
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
19.00.04 Медыцынская псіхалогія
ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
10.01.02 Руская літаратура
10.02.19 Тэорыя мовы*
КАФЕДРА АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ І МАЎЛЕНЧАЙ КАМУНІКАЦЫІ
10.02.19 Тэорыя мовы
ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ
10.01.10 Журналістыка
ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
12.00.01 Тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя вучэнняў аб праве і дзяржаве*
12.00.03 Грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права*
12.00.08 Крымінальнае права і крыміналогія; крымінальна-выканаўчае права*
КАФЕДРА ПЕДАГОГІКІ І ПРАБЛЕМ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ
13.00.01 Агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі*
КАФЕДРА ФІЗІЧНАГА ВЫХАВАННЯ І СПОРТУ
13.00.04 Тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі, аздараўленчай і адаптыўнай фізічнай культуры
ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
25.00.01 Агульная і рэгіянальная геалогія*
25.00.33 Картаграфія*

* Мэтавыя месцы

**У дактарантуру** прымаюцца асобы, якія маюць вучоную ступень кандыдата навук і якія з'яўляюцца аўтарамі навуковых артыкулаў, а таксама іншых матэрыялаў па выніках навуковых даследаванняў (манаграфій, матэрыялаў, якія адносяцца да аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку, матэрыялаў і (або) тэзісаў дакладаў на канферэнцыях, справаздач аб выкананых даследаваннях і распрацоўках, актаў (дакедак) аб іх выкарыстанні, якія пацвярджаюць удзел у выкананні дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, навукова-тэхнічных праграм і інавацыйных праектаў па прыярытэтных напрамках навуковых даследаванняў альбо прыярытэтных напрамках навукова-тэхнічнай дзейнасці), якія складаюць аснову для доктарскай дысертацыі з магчымасцю яе завяршэння на працягу трох гадоў.

Асоба, якая паступае ў дактарантуру, павінна выступіць у структурным падраздзяленні ўстановы пасляўніверсітэцкай адукацыі, якое адпавядае профілю яго даследаванняў, з навуковым дакладам, у якім абгрунтоўваецца выбік навуковага даследавання па тэме меркаванай дысертацыі і абгрунтоўваюцца тэрміны яе выканання.

Асобы, якія паступаюць у дактарантуру, падаюць на імя рэктара заяву, да якой прыкладаюць дакументы ў адпаведнасці з пералікам, што вызначаецца Міністэрствам адукацыі. Дакумент, які сведчыць асобу, і арыгіналы дакументаў аб адукацыі прад'яўляюцца пры паступленні ў дактарантуру асабіста.

Прыёмная камісія разглядае прадстаўленыя дакументы, праводзіць сумоўе з тым, хто паступае ў дактарантуру, і прымае заключэнне прыёмнай камісіі, афармленае ў выглядзе выпіскі з пратакола пасяджэння, у якім даецца ацэнка абгрунтаванасці прадстаўленага плана падрыхтоўкі дысертацыі, змяшчаецца прапанова аб накіраванні таго, хто паступае ў дактарантуру, у адпаведнае структурнае падраздзяленне для выступлення з навуковым дакладам, допуску да ўдзелу ў конкурсе, прызначэнні яму пры неабходнасці навуковага кансультанта.

**У 2012 г. У ДАКТАРАНТУРУ БДУ АЖЫЦЦЯЎЛЯЕЦЦА ПРЫЁМ ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:**

**дзённая форма навучання:**

БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
03.01.05 Фізіялогія і біяхімія раслін*
ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
07.00.03 Усеагульная гісторыя (адпаведнага перыяду)*
ФАКУЛЬТЭТ ФІЛАСОФІІ І САЦЫЯЛЬНЫХ НАВУК
09.00.11 Сацыяльная філасофія
ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ
10.01.10 Журналістыка
ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
25.00.36 Геаэкалогія (па галінах)*

* Мэтавыя месцы

**Навучанне ў форме суіскальніцтва:**

ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
10.01.03 Літаратура народаў краін замежжа (з указаннем канкрэтнай літаратуры)
ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ
12.00.06 Прыродарэсурснае права; аграрнае права; экалагічнае права*

* Мэтавыя месцы

На падставе рашэння прыёмнай камісіі аб залічэнні ў аспірантуру (ад'юнктуру), дактарантуру па выніках конкурсу ўстанова пасляўніверсітэцкай адукацыі ў вызначаным парадку ў тыднёвы тэрмін заключае дамову аб падрыхтоўцы навуковага работніка вышэйшай кваліфікацыі.

Пачатак заняткаў – 1 лістапада 2012 года.

СПОРТПЛЯЦОЎКА

# Студэнцкі футбол набірае абароты

**Развіццю і папулярызацыі гульні нумар адзін сярод моладзі ў нашай краіне надаецца ўвага на самым высокім узроўні. Старшыня асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» Сяргей Румас і міністр адукацыі Сяргей Маскевіч 16 мая ў Доме футбола падпісалі мемарандум аб стварэнні студэнцкай футбольнай лігі. У цырымоніі прыняў удзел першы прарэктар БДУ Міхаіл Жураўкоў.**



*Зборная БДУ (у сіняй форме) – адзін з фаварытаў СФЛ*

«Футбол – безумоўны лідар па папулярнасці ў студэнцкім асяроддзі, і стварэнне сваёй лігі дасць новы стымул для навучэнцаў. У Беларусі рэгулярна праводзяцца ўніверсіяды сярод ВНУ, у якіх футбол з'яўляецца адным з ключавых і самых відовішчных відаў спаборніцкай праграмы», – адзначыў міністр адукацыі.

Дырэктар спартыўнага клуба БДУ **Аляксей Камінскі** даў свой каментар.

– Стварэнне студэнцкай футбольнай лігі – значная падзея для беларускага спорту. Нездарма ў падпісанні мемарандума ўдзельнічалі віцэ-прэм'ер і міністр адукацыі, дырэктар РЦФВС Валянціна Баляба, прарэктары некаторых ВНУ, спецыялісты Беларускай федэрацыі футбола.

Было адзначана, што ў нашым універсітэце надаюць вялікую ўвагу развіццю спорту і футбола ў прыватнасці. БДУ ўносіць свой уклад таксама ў развіццё мініфутбола, жаночага футбола, нашы студэнты паспяхова выступаюць ва ўсіх магчымых спаборніцтвах. Хвалы ўдастоілася футбольнае поле спарткомплексу «Універсітэцкі». Акрамя БДУ, штучным газонам валодае ў сталіцы толькі БДАТУ. І матчы студэнцкай футбольнай лігі ў Мінску плануецца праводзіць у асноўным на гэтых двух палях.

***– Раней студэнцкія спаборніцтвы па футболе праходзілі ў рамках рэспубліканскай універсіяды. У чым галоўныя адрозненні студэнцкай лігі ад спаборніцтваў старога фармату?***

– Вынікі студэнцкай футбольнай лігі таксама пойдуць у залік рэспубліканскай універсіяды. Але фармат футбольных спаборніцтваў сапраўды змяніўся ў лепшы бок. Раней студэнты ўсіх ВНУ збіраліся на футбольны турнір усяго адзін раз у год. Звычайна спаборніцтвы праходзілі ў Мінску: на працягу тыдня каля 30 каманд высвятлялі адносіны на футбольных палях, пасля чаго надоўга раз'язджаліся. Студэнцкая футбольная ліга дасць магчымасць праводзіць сярод ВНУ паўнавартасны чэмпіянат па футболе. Адчуйце розніцу: замест лічаных дзён студэнцкім спаборніцтвам адведзена 3 месяцы. Матчы праходзяць раз у тыдзень з красавіка па чэрвень. І, што важна, не толькі ў Мінску, але па ўсёй краіне.

***– Нядаўна стала вядома, што студэнцкая футбольная ліга з'явіцца і ў нашых суседзяў – у Расіі. Рэспубліканская студэнцкая футбольная ліга ствараецца з улікам замежнага вопыту?***

– Ініцыятарамі стварэння РСФЛ з'яўляюцца Міністэрства адукацыі сумесна з Міністэрствам спорту, і яны напэўна вывучалі міжнародны вопыт. На мой погляд, спаборніцкая сістэма, распрацаваная для нашых студэнтаў, блізкая да заходніх сістэм. У ЗША і іншых краінах даўно існуюць такія маштабныя, працяглыя студэнцкія чэмпіянаты.

Дарэчы, далей у нас павінны з'явіцца студэнцкія лігі і па іншых гульнявых відах спорту, напрыклад, па валейболе.

***– Якім чынам будзе рэкламавацца новая ліга?***

– У Доме футбола прагучалі словы пра неабходнасць большай папулярызацыі спорту ў студэнцкім асяроддзі. Пра гэта гаварылі і Сяргей Румас, і Валянціна Баляба. Футбол, вядома, і так папулярны, але не варта спыняцца на дасягнутым. Каб не мець недахопу ўдзельнікаў падобных спаборніцтваў, прыцягнуць максімум заўзятараў, студэнцкай футбольнай лізе будзе аказана ўсебаковая падтрымка з боку СМІ. У сталіцы асвятленнем футбольнага жыцця студэнцтва зоймецца моладзевае тэлебачанне «Універсітэт-ТБ», якое аб'ядноўвае мінскія ВНУ.

Сваімі думкамі пра рэаліі і будучыню студэнцкага спорту падзяліўся з намі і галоўны трэнер зборнай БДУ па футболе **Віталь Крупіца.**

– Стварэнне ўласнай футбольнай лігі – важны крок на шляху развіцця студэнцкага спорту. Патэнцыял у яго велізарны, і пакуль ён рэалізаваны далёка не поўнасцю. Так што ініцыятыву спартыўнага кіраўніцтва краіны аб стварэнні студэнцкіх ліг, спачатку баскетбола, а цяпер і футбола, я ўспрыняў з радасцю.

Упэўнены, стварэнне студэнцкай футбольнай лігі неўзабаве прынясе свой плён. І не толькі для азадараўлення, развіцця фізічнай культуры сярод моладзі (а гэта найважнейшая задача студэнцкага спорту), але і для спорту прафесійнага. Таму што сярод студэнтаў шмат таленавітых спартсменаў, якія ў перспектыве змогуць выступаць нават на міжнародным узроўні. Галоўнае – дапамагчы ім рэалізаваць свае магчымасці.

Калісьці я і сам быў студэнтам БДУ і адчуваў недахоп спартыўнага складніка ў навучальным працэсе. Выступаючы за футбольную зборную ВНУ, лавіў сябе на думцы, што я і мае таварышы маглі б прыносіць больш карысці для папулярызацыі футбола, спорту і самога ўніверсітэта.

***– Якія мэты ставіць перад сабой зборная БДУ ў студэнцкіх спаборніцтвах?***

– Мэты ў нас заўсёды максімальныя. Так, у нас не самы моцны склад гульцоў: як правіла, найлепшыя футбалісты вучацца ў тых ВНУ, дзе ёсць спецыялізаваныя спартыўныя факультэты. А ў БДУ такога факультэта няма. Але затое ў нас ёсць выдатны стадыён. І, што не менш важна, кіраўніцтва ўніверсітэта і кафедры фізвыхавання ў асобах рэктара Сяргея Абламейкі і Віктара Каляды заўсёды ідзе нам насустрач і стварае найлепшыя ўмовы для падрыхтоўкі да спаборніцтваў.

Улічваючы ўсе абставіны, мы выступаем добра. Канкурэнцыя ў футболе сярод ВНУ, напэўна, вострая як ні ў якім іншым відзе спорту. Але мы працуем, стараемся і дасягаем прыкметных вынікаў. Летась наша зборная заняла трэцяе месца на ўніверсіядзе. І для нас гэта вялікі поспех. Таму што, як я ўжо сказаў, у нашым складзе няма гучных імёнаў, няма гульцоў з «вялікіх» клубаў.

***– Ці будзе зборная БДУ ўзаемадзейнічаць з камандай «Зорка БДУ», якая выступае ў 2-й лізе чэмпіянату краіны?***

– Супрацоўніцтва даўно наладжана, і вельмі плённае. Ад сябе магу падзякаваць дырэктару РЦАП БДУ Уладзіміру Пігулеўскаму, які заўсёды ідзе нам насустрач. Студэнты, якія выступаюць у яго камандзе, з задавальненнем прыязджаюць на ўсе спаборніцтвы і прыносяць нашай зборнай вялікую карысць.

***– Як вядома, Вы з'яўляецеся дзейным гульцом зборнай Беларусі па пляжным футболе. Гэта акалічнасць неяк дапамагае ў трэнерскай працы?***

– У пляжны футбол я трапіў выпадкова, але працягваю гуляць. Цяпер з'яўляюся капітанам зборнай. Узрост яшчэ дазваляе выступаць за каманду, і самае галоўнае – ёсць жаданне. Гэты від спорту з'яўляецца паўпрафесійным. У вольны ад працы час займаюся ім з задавальненнем.

На трэніроўках студэнцкай зборнай я ўвесь час бегаю з хлопцамі, трэніруюся сам. Хлопцы заўсёды з задавальненнем са мной гуляюць, у нас наладжаны добры кантакт. Імкнуся падаваць ім станоўчы прыклад сваім стаўленнем да трэніравальнага працэсу, да футбола. Я імкнуся паказаць, што мы робім важную справу – для мяне, для іх, для БДУ. І я бачу, што, калі я трэніруюся, яны працуюць з падвоенай энергіяй.

**Ілья ТРАФІМАЎ**

ДОБРАЯ СПРАВА

# «Падары дзецям дом!»

**З 3 па 17 мая прайшла дабрачынная акцыя «Падары дзецям дом!», арганізаваная ГДА «Беларускі дзіцячы хоспіс» і студэнтамі БДУ. Асноўнай мэтай была падтрымка будаўніцтва сучаснага хоспіса для невылечна хворых дзяцей у Бараўлянах у пасёлку «Вопытны», а таксама інфармаванне насельніцтва.**

Раней падобных дабрачынных акцый і такога маштабу ў нашым універсітэце не праводзілася. Усяго ў акцыі «Падары дзецям дом!» прыняло ўдзел 21 навучальнае падраздзяленне БДУ. Цікавасць да мерапрыемства праявілі Беларускае радыё і партал TUT.BY, а таксама БТ (канал «Беларусь–1»).

У дзень акцыі кожны мог зайсці ў фае факультэта, дзе стаялі пікеты з інфармацыйным стэндам пра дзейнасць Беларускага дзіцячага хоспіса, і зрабіць ахвяраванне на будаўніцтва новага будынка хоспіса. На працягу ўсяго дня на пікетах прысутнічалі валанцёры БДУ, якія раздавалі інфармацыйныя матэрыялы і маглі падрабязна распавесці пра Беларускі дзіцячы хоспіс. Акрамя студэнтаў і супрацоўнікаў акцыя прыцягнула ўвагу і іншых людзей.

«Да нас на факультэт прыходзілі людзі і казалі, што ўбачылі па тэлевізары інфармацыю пра акцыю і яны спецыяльна прыехалі, каб прыняць у ёй удзел», – распавяла каардынатар гістарычнага факультэта Яўгенія Грабянко.

Усяго ў выніку дабрачыннай акцыі «Падары дзецям дом!» было сабрана 26 836 000 рублёў!



У правядзенні гэтай акцыі прымалі ўдзел як звычайныя студэнты БДУ, так і хлопцы і дзяўчаты з валанцёрскай арганізацыі БРСМ БДУ «Абдымкі». Асаблівую падзяку хацелася б выказаць *Карніцкай Крысціне* (ФРКТ, 3 курс), *Юхо Кацярыне, Фешчанцы Марыне* (юрфак, 4 курс), *Грабянко Яўгеніі* (гістфак, 4 курс), *Урбановіч Вераніцы* (ФМА, 1 курс), *Янушэўскай Дар'і, Васільчук Анастасіі, Севасцьянчук Кацярыне, Вострых Кірылу, Куцу Аляксею* (ФФСН, 2 курс), *Трэмзінай Валерыі і Фраловай Вользе* (хімфак, 1 курс). Наша шчырая ўдзячнасць таксама прарэктару па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях *Уладзіміру Васільевічу Суворову*, які даў «зялёнае святло» акцыі ў БДУ.

Сярод факультэтаў рэкардсменамі па зборы грошай сталі юрыдычны, хімічны і фізічны. Вельмі адказна і сур'ёзна да акцыі паставілася кіраўніцтва юрыдычнага каледжа, у прыватнасці, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Мокат Ірына Пятроўна. Нашым валанцёрам прапанавалі не проста пастаяць на інфармацыйным стэндзе, але і прайсціся па аўдыторыях і расказаць навучэнцам пра дзейнасць Беларускага дзіцячага хоспіса. Акрамя таго, самі работнікі юркаледжа прынялі ўдзел у акцыі.

Усім, хто ўнёс свой уклад у будаўніцтва новага дзіцячага хоспіса для невылечна хворых дзетак, велізарнае дзякуй! Да ведама, акцыя «Падары дзецям дом!» праводзілася ў рамках агульнай акцыі Беларускага дзіцячага хоспіса «Пабудуем новы хоспіс разам». І цяпер збор грашовых сродкаў для будаўніцтва новага дзіцячага хоспіса працягваецца, бо праект будзе рэалізоўвацца на працягу некалькіх гадоў (2012–2015). Для гэтага быў адкрыты дабрачынны рахунак. Вось рэквізіты:

ААТ «БПС-Ашчадбанк», код 369

Разліковы рахунак №: 3135145259013 (беларускі рублі)

Атрымальнік: ГДА «Беларускі дзіцячы хоспіс», 223053 Мінскі р-н, в. Бараўляны, вул. Бярозавы гай, 100А, УНП 100806662

Прызначэнне ахвяравання: на праектныя і будаўнічыя працы для новага хоспіса.

З падрабязнай інфармацыяй можна азнаёміцца на сайце *newhospice.by*. А калі хтосьці захацеў стаць валанцёрам Беларускага дзіцячага хоспіса, то ён можа зайсці на сайт hospice.by ў раздзел «Валанцёрам» і запоўніць размешчаную на сайце анкету.

**Ясенія БАНДАРЫК,**
**валанцёр Беларускага**
**дзіцячага хоспісу**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года
28 чэрвеня 2012 года
Падпісана да друку 26.06.2012 г.
Зак. . Тыраж 1500 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6
Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by